# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

**Выпуск №14–15 (студзень)**

Наклад 3000 асобнікаў


## Анонс


Галоўныя літаратурныя ПАДЗЕІ, даты і навіны месяца..с.2–3

ФОРУМ «Ь»: Алег Аблажэй пра ролю нацыянальнай літаратуры і Васіль Якавенка пра нацыю і народ... с.4

Артыкул Віктара Хурсіка «Беларусы не хварэлі на бальшавізм» с.5

П'ЕСА-анекдот Анатоля Санаценкі «Тайная паліцыя».....с.6–7

ПРОЗА: Новыя «Фрэскі» Барыса Пятровіча с8–9

ВЕРШЫ Юркі Буйнюка і Міколы Канановіча с.10

АПАВЯДАННЕ «Акно для прэзідэнта» Іллі Расолава с.11

Вершаваныя ПЕРАКЛАДЫ тэкстаў Ніны Кур'яты і Раісы Ахматавай с.12

БІБЛІЯТЭКА «Ь»: рэцэнзія і свежыя кнігі с.13

КНІГАПІС: анатацыі выданняў на нашых паліцах с.14

СВЕТ: найістотнае з літаратурнага жыцця замежжа с.15

ЛІТКАКТЭЙЛЬ: «Літкаляндар», «Лісты», «Акцыя» с.16


**ТРЫБУНА**

# ЧАКАННЕ ВЯСНЫ

*Алесь АКУЛІЧ*




**Мінуў 2007 год.**

**Не прайшоў, не адбыўся: мінуў. Мінуў і нас, і краіну. Так разыходзяцца рэчка і бераг, цягнік і станцыя, вецер і гара. Рэчка, цягнік і вецер — ужо ў заўтрашнім, у будучым. А мы?**

Азірнёмся — і цэны растуць, і ільготаў няма, і ўсмешак (нават калядных) няма, і спакою няма цяпер не толькі ў апазіцыйных палітыкаў ды незалежных творцаў, але і ў індывідуальных бізнэсоўцаў.

Беларускія літаратары, зрэшты, былі першымі пастаўленыя ў варункі цяперашніх прадпрымальнікаў, і выступалі не слабей апошніх, і — выжылі...

Год закончыўся, але не скончылася беларуская літаратура. Тая, якая не служыла ні расійскім царам ды царыцам, ні мясцовым-тутэйшым. Гаворка не пра «холдынскую» «дзяржаўную» літаратуру, якая, відавочна, чаўрэе не толькі ідэйна-тэкстава, але і ў чытацкай цікавасці, ды — і фінансавай «заахвочвальнасці» (нават законныя ганарары спазняюцца больш чым на паўгода). Размова — пра асуджаную на бязмоўе, беспрытульнасць і самвыдавецкасць нацыянальную літаратуру. Вось жа сусветны феномен: ёсць годная сучасная нацыянальная літаратура — але ці ёсць такая ж нацыя?..



2007 год — у гісторыі, але ягоная літаратура — пакуль у дні цяперашнім. Бо не мінае яшчэ напісанае за той час Валянцінай Аксак, Эдуардам Акуліным, Уладзімерам Арловым, Рыгорам Барадуліным, Генадзем Бураўкіным, Анатолем Вярцінскім, Нілам Гілевічам, Юркам Голубам, Леанідам Дранько-Майсюком, Зінаідай Дудзюк, Сяргеем Законнікавым, Васілём Зуёнкам, Вольгай Іпатавай, Віктарам Казько, Віктарам Карамазавым, Алесем Каско, Анатолем Кудраўцом, Хрысцінай Лялько, Нінай Мацяш, Вінцэсем Мудровым, Уладзімірам Някляевым, Дзмітрыем Падбярэзскім, Сяргеем Панізнікам, Барысам Пятровічам, Людмілай Рублеўскай, Францам Сіўко, Міхасём Скоблам, Юры Станкевічам, Лерай Сом, Уладзімірам Сцяпанам, Антанінай Хатэнка, Віктарам Ярацам, не мінае напісанае ў мінулым годзе дзесяткамі маладзейшых «правільна-няправільных» творцаў — ад Аксаны Данільчык да Андрэя Паўлухіна, ад Аксаны Спрынчан да Віктара Жыбуля... Не ў крыўду старэйшым: сённяшнія 20-30-цігадовыя шмат у чым — і смялейшыя, і актыўнейшыя, і — сучасна-заўтрашнія.

Не мінаюць сотні выдадзеных за мінулы год кніг і часопісаў. Годна ўрэчаісніваліся ў 2007-м чатыры кніжныя праекты: «Нашай нівы», выдавецтва Логвінава, Радыё Свабода і часопіса «Дзеяслоў».

Не мінаюць сувязі і сардэчнасць дзесяткаў літфестываляў-форумаў, праведзеных з удзелам і беларускіх паэтаў ды празаікаў — такіх, як Нідскі форум, Паэтычны фестываль «Вялікае княства паэзіі», польскае «Бязмежжа» ды іншых. А чаго варты месячны «літдэсант» беларусаў у Чэхіі? А стварэнне «балтыйска-чарнаморскага» Саюза пісьменнікаў — Міжнароднай асацыяцыі пісьменніцкіх саюзаў «Слова без межаў» (куды ўвайшоў і Саюз беларускіх пісьменнікаў, які будзе старшыняваць у Асацыяцыі ў годзе 2008-м)?

Былі «дзяржаўныя» юбілеі нацыянальных класікаў Купалы і Коласа — але ці так, як належыла ім быць? І былі юбілеі «пазадзяржаўныя»: Янкі Брыля, Алеся Адамовіча, Рыгора Крушыны, Юркі Голуба, Алеся Разанава. Быў пяцігадовы юбілей недзяржаўнага «Дзеяслова». Былі юбілеі і будуць. Такія, як 200-годдзе з дня нараджэння пачынальніка новай беларускай літаратуры Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ці 70-годдзе з дня расстрэлу пісьменніка і прэм'ер-міністра БНР Вацлава Ластоўскага... І — 90-я ўгодкі абвяшэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэта — у годзе 2008-м.

Былі ды будуць і далейшыя рэпрэсіі. 2007 год — год апагею «літпакаранняў»: перапісаныя школьныя праграмы па беларускай літаратуры і выкінутыя «ідэалагічна няправільныя» творцы; сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў уладамі забаронена сустракацца ў школах, універсітэтах і бібліятэках з чытачамі, а таксама — атрымліваць дзяржаўныя прэміі нават абласнога маштабу (як у Брэсце прэмію імя У.Калесніка); ліквідаваны Беллітфонд ды канчаткова выкінутыя «нячэсныя» пісьменнікі са свайго Дома літаратара... А адмова ў рэабілітацыі класіка нацыянальнай паэзіі Ларысы Геніюш? І г.д...

Праблем безліч, яны розныя. І, на жаль, галоўныя вырашыць у цяперашніх умовах не можа нават увесь сектар недзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў: свабода выказвання, дзяржцэнзура, татальнае выцясненне з грамадскага жыцця беларускай мовы, маральная і духоўная дэградацыя насельніцтва (чытачоў)...

Тым не менш, 2007 год у беларускім літаратурным жыцці можна назваць Годам упэўненай адаптацыі. Не толькі выстаялі, не скарыліся эканамічным, уладным, псіхалагічным ды іншым ціскам, а — загартаваліся. Зірніце на агульнанацыянальны грамадска-літаратурны працэс года — ён жа нашмат багацейшы ды размаіцейшы, чым у лепшыя свабодныя часы!

У тым і загадка літаратуры, якая сама сабе — і закон, і ўлада.

2007 год канчаткова «разжаніў» беларускую літаратуру і сучасную дзяржаву-ўладу. Хоць ідэя дзяржаўнасці, чаканне Вясны — як гэта не парадаксальна, — застаецца асноўнай у нашай «пакінутай» літаратуры. І зноў, як 90 гадоў таму ў часы Беларускай Народнай Рэспублікі, беларускія творцы абвяшчаюць 2008 год годам беларускай дзяржаўнасці. Беларускаму чаканню Вясны сёлета — 90 гадоў!

У 2007-м быў створаны Агульнанацыянальны аргкамітэт па святкаванні 90-х угодкаў БНР. Да ягонай дзейнасці спрычыніцца разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі і Саюз беларускіх пісьменнікаў. Нядаўна адбылося пашыранае пасяджэнне сустаршыняў Агульнанацыянальнага аргкамітэта з кіраўнікамі палітычных партый і рухаў. Былі прынятыя звароты да беларускага народу і органаў улады Рэспублікі Беларусь «Аб абвяшчэнні 2008 года, года 90-га юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі, — Годам беларускай дзяржаўнасці».

У накіраваных Аргкамітэтам зваротах да Нацыянальнага Сходу і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прапанавана надаць 2008 году афіцыйны статус Года беларускай дзяржаўнасці і абвясціць 25 сакавіка дзяржаўным святам.

Акрамя таго прапанавана даць афіцыйны дазвол на ўсталяванне памятных знакаў на будынку тэатра імя Янкі Купалы ў Мінску, дзе праходзіў Першы Усебеларускі кангрэс (1917 г.), і будынку, дзе была абвешчана незалежнасць БНР (Мінск, вуліца Валадарскага, 9), вярнуць у заканадаўчае поле і легальны грамадскі ўжытак нацыянальную гістарычную сімволіку і атрыбутыку, якія ў БНР мелі дзяржаўны статус.

У звароце да беларускага народу Агульнанацыянальны аргкамітэт заклікае ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь у новым годзе прыняць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні 90-х угодкаў БНР, бо «кожная беларуская сям'я — гэта цаглінка ў гмах беларускай дзяржаўнасці, гэта паўнапраўны чыннік і творца яе сучаснай гісторыі».

А што ж беларуская сям'я? Ці ведае яна аб тым, што БНР дэкларавала ўшматкроць больш сацыяльных ды іншых правоў, чым БССР? Ды і ці ведае тая сям'я наогул пра юбілей БНР, як і пра БНР наогул?

«Літаратурная Беларусь» у наступных выпусках шмат матэрыялаў прысвеціць «літаратурнай» гісторыі БНР: асобам, сімвалам, гісторыі.

...Мінуў 2007 год. Беларусь сустрэла 2008-ы.

І ў новым годзе будуць новыя кнігі, фестывалі, выступы, сустрэчы. Бо рэчцы, цягніку і ветру наканавана сустрэцца са сваімі берагамі, станцыяй і гарой.

Дык — будзьма!

**СЛОВА**

## Паважаныя чытачы!

«Літаратурная Беларусь» («Ь») таксама ўвайшла ў новы год. Напрыканцы года старога шырыліся грамадскія размовы вакол нашага спецвыпуску. Вялікі дзякуй усім за віншаванні, добрыя і крытычныя водгукі.

Найбольш лістоў і тэлефанаванняў мы атрымалі ад «шэраговых» чытачоў. Яны шчырыя, сардэчныя, натхняльныя. Водгукі калегаў-літаратараў розняцца: ад цалкам станоўчых да крытычных. Сярод апошніх: «Літаратурная Беларусь» спрабуе падмяніць сабою «ЛіМ»; канцэпцыі «Літаратурнай Беларусі» няма і пад.

Паўторым і нагадаем: кожны выпуск «Літаратурнай Беларусі» — сціплае адлюстраванне нашага літаратурна-грамадскага жыцця. Ёсць у тым жыцці «канцэпцыя» — ёсць яна і ў «Ь». Люстэрка ёсць люстэрка. Нехта хоча глядзець у яго шматкроць на дзень, а нехта — і разбіць...

Абы яно не было крывым, як той сённяшні згаданы «ЛіМ»...

Чакайце і чытайце «Ь» і надалей — у кожную апошнюю пятніцу месяца!

ЛІТІНФАРМ



# СТУДЫЯ І ЗБОРНІК СУЧАСНАЙ ДРАМАТУРГІІ АД «ВОЛЬНАГА ТЭАТРА»

**У 2008 годзе «Вольны тэатр» плануе стварыць у Мінску тэатральную студыю: набраць маладых людзей і заняцца іхняй адукацыяй. Аб гэтым у інтэрв'ю БЕЛАПАН паведаміў мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Халезін. У студзені «Вольны тэатр» правядзе тры тыдні на гастролях у Нью-Ёрку і Лос-Анджэлесе. Таксама ў ЗША плануецца рэалізаваць сумесны педагагічны праект з Каліфарнійскай школай мастацтваў.**




Тэатр плануе трохтыднёвыя гастролі ў Англіі. У Лондане і Лідсе калектыў прадставіць пастаноўкі «Быць Гаральдам Пінтэрам» і «Пакаленне Jeans». М.Халезін адзначыў, што будзе рэалізаваны педагагічны праект з Брытанскай школай сцэнічнай прамовы і драматургіі: беларускаму тэатру прапанавалі правесці тыднёвы курс са студэнтамі.

У красавіку ў Салоніках (Грэцыя) «Вольнаму тэатру» будзе ўручаная тэатральная прэмія Еўропы. Перад тым калектыў прадставіць прэм'еру трылогіі «Зона маўчання», а таксама спектаклі «Быць Гаральдам Пінтэрам» і «Пакаленне Jeans».

У Мінску пройдзе прэзентацыя кнігі перакладаў п'ес маладых драматургаў Беларусі «Пакаленне Jeans», якую выдаў «Вольны тэатр». Кніга выйшла на беларускай мове ў перакладзе прафесара Андрэя Каляды. У выданне ўвайшлі п'есы Дыяны Балыка, Паўла Пражка, Кастуся Сцешыка, Яны Русакевіч, Наталлі Каляды, Мікалая Халезіна і інш. «Мы разашлём па пяць асобнікаў кнігі ў кожны беларускі тэатр, каб больш не было выказванняў аб тым, што ў Беларусі няма сучаснай драматургіі», – сказаў М.Халезін.

«Вольны тэатр» быў створаны два з паловай гады назад. Трупа не мае ўласнай сцэны, памяшкання для рэпетыцый, фінансавання, таму спектаклі «Вольнага тэатра» ў Беларусі праходзяць на розных пляцоўках. Як правіла, такія паказы шырока не афішуюцца.

На працягу 2007 года «Вольны тэатр» наведаў шэраг еўрапейскіх тэатральных фэстаў і атрымаў на іх «цалкам бліскучую крытыку». Аб гэтым, падводзячы падрахункі года, паведаміў мастацкі кіраўнік тэатра М.Халезін. «Гэта, па сутнасці, вывела «Вольны тэатр» у вышэйшую лігу еўрапейскіх тэатраў… Вольны тэатр падышоў да фармавання сваёй тэатральнай мовы, менавіта за кошт якой калектыў мае такую пільную ўвагу еўрапейскай крытыкі. Гэтая мова аказалася вельмі наватарскай і нестандартнай для Еўропы», – сказаў ён. – Тэатр практычна сфармаваў свайго гледача ў Беларусі: на сённяшні дзень на спектаклі сабраць гледачоў у Мінску – гэта не праблема. Больш за тое, гэта глядач, які лепш усіх разумее тое, аб чым мы гаворым», – дадаў М.Халезін.

На працягу года тэатрам было пастаўлена шмат спектакляў як у Мінску, так і за мяжой. У рэпертуары калектыва 10 пастановак. Год завяршыўся прыемнай падзеяй: «Вольны тэатр» атрымаў прэмію Французскай Рэспублікі ў вобласці абароны правоў чалавека. Яна была ўручаная ў Парыжы 10 снежня.

Нагадаем, у жніўні мінулага года падчас прэм'еры «Вольнага тэатра» былі затрыманы ўсе гледачы і акцёры, уключаючы грамадзян Францыі і Галандыі. Пазней прадстаўнікі міліцыі растлумачылі свае дзеянні званком невядомага з нагоды шуму, які даносіўся з будынку, дзе праходзіў паказ...

**Паводле www.naviny.by**

# ЯНКА КУПАЛА Ў ААН

**У будынку штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку адкрылася выстава, прысвечаная Янку Купале – экспазіцыя «Творчасць Янкі Купалы ў кантэксце сусветнай культуры», якая прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА у пастаянным прадстаўніцтве Рэспублікі Беларусь пры ААН.**

Падрыхтаваная высілкамі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы выстава распавядае аб шматгранных творчых і чалавечых сувязях вялікага беларускага паэта з культурамі і літаратурамі народаў свету. Зробленыя Янкам Купалам пераклады на беларускую мову шэдэўраў сусветнай літаратуры, пераклады твораў паэта на дзесяткі моў народаў свету, сяброўства і знаёмствы, якія звязалі паэта з літаратарамі шматлікіх замежных краін – усё гэта стала прадметам маляўнічага мастацкага адлюстравання ў экспазіцыі.

Згаданая выстава стала трэцяй экспазіцыяй, якую Рэспубліка Беларусь арганізавала ў штаб-кватэры ААН у 2007 годзе.

**Паводле БЕЛТА**

# КАРЛСАН У МІНСКУ

**У Мінскай абласной бібліятэцы імя А.Пушкіна адбылася прэзентацыя першага перакладу на беларускую мову аповесці Астрыд Ліндгрэн «Малы і Карлсан-з-даху». Кніга выйшла ў выдавецтве Змітра Коласа ў перакладзе са шведскай мовы Юрася Жалезкі пад рэдакцыяй Лявона Баршчэўскага акурат да стагоддзя сусветнавядомай пісьменніцы. Імпрэза праходзіла ў фармаце дзіцячага свята – Дня народзінаў Карлсана.**




У святочна ўбранай зале пад канцэрт цымбалістак дзеці смакталі цукеркі-ледзяшы, малявалі ды забаўляліся з мыльнымі бурбалкамі. У займальнай форме гаспадар свята Карлсан ды аўтары праекту Алесь Яўдаха і Настасся Мацяш пазнаёмілі маленькіх і дарослых прыхільнікаў творчасці Астрыд Ліндгрэн з працэсам стварэння. Перакладчык пакідаў свае аўтографы на кніжках, а мастачка Марына Рудзько размалёўвала балонікі. Дзеткі віншавалі Карлсана і фатаграфаваліся з улюбёным героем.

Аздобленую каляровымі ілюстрацыямі кнігу можна набыць у кнігарнях, на кніжных кірмашах і ў Інтэрнэце праз сайты www.OZ.by і www.knihi.net (кошт ад 16 000 руб.).

**Наш Кар.**

# ВІЦЕБСКІЯ РАМАНТЫКІ

У сярэдняй школе №45 Віцебска дзейнічае літаратурна-музычная гасцёўня «Рамантыкі душы». На сустрэчы да маладых творцаў прыходзяць вядомыя ў горадзе людзі. Так, у гонар 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы да «рамантыкаў» завітаў сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў Уладзімір Папковіч, якога вядоўца сустрэчы бібліятэкар Л.Багадухава назвала «чалавекам без узросту». У. Папковіч пераклаў на нямецкую мову вядомую сатырычную паэму «Тарас на Парнасе» і выдаў яе ў Беластоку. Паводле нямецкіх водгукаў, пераклад гучыць натуральна. Рыхтуецца выданне «Тараса на Парнасе» ў перакладзе на 7 моў. Школьнікам паэт і педагог прачытаў некалькі сваіх арыгінальных вершаў і расказаў пра сябе.

Працягнулі сустрэчу песні барда Уладзіміра Пракоп'ева.

Педагогі і школьнікі спадзяюцца, што сустрэчы ў іхняй гасцёўні будуць натхняць на творчасць і ўчобу ды стануць перыядычнымі.

**Ніна КАЎПАК, настаўніца, кіраўнік гуртка «Рамантыкі душы», куратар клуба ЮНЕСКА пры СШ №45 Віцебска**

КРАЙ

# ПАМЯЦЬ – ПРАЗ СПРАВЫ

**Мікашэвічы ў свой час былі раённым цэнтрам, потым увайшлі ў склад Лунінецкага раёна, пару гадоў таму атрымалі статус горада. Вядомыя найперш буйнейшым прадпрыемствам «Граніт». Велізарнейшы кар'ер з серпанцінам аўтадарогі нагадвае горныя пейзажы, чым пачалі ўжо карыстацца беларускія кінематаграфісты пры здымках розных «маёраў ветравых».**

Але з Мікашэвічамі звязаны і шэраг старонак айчыннай літаратурнай гісторыі. Некалі ў якасці дэпутатаў Вярхоўнага Савета тут бывалі Якуб Колас, Максім Лужанін... У Мікашэвічах працавалі пэўны час Аляксей Гардзіцкі, Андрэй Федарэнка... Тут нарадзіўся польскі пісьменнік Багдан Мадэй... Але найперш трэба згадаць Уладзіслава Іосіфавіча Нядзведскага (1929-1973). У Мікашэвічы дзіцячы дом будучы паэт і празаік патрапіў пасля таго, як фашысцкія карнікі ў час вайны вынішчылі ўсю яго сям'ю – за выключэннем малодшай сястры.

У Лунінецкім раённым музеі захаваўся дзённік старшакласніка Валодзі (менавіта так!) Нядзведскага, з якога бачна, як сталеў будучы літаратар. Пазней пісьменнік выведзе пад назвай Кірмашэвічы пасляваенны пасёлак у аповесці «Хлопцы з другога корпуса», большасць герояў якой маюць канкрэтных прататыпаў.

У 1999 годзе ў Мікашэвічах была адкрыта гімназія, дзе неўзабаве ўзнік музей У. Нядзведскага. Праз пэўны час гімназія атрымала імя слыннага земляка, а на яе фасадзе з'явілася мемарыяльная шыльда. Калектыў педагогаў і вучняў на чале з дырэктарам С.П.Высоцкім зрабіў навучальную ўстанову адным з літаратурных цэнтраў Лунінеччыны. Урокі тут частуюць выступалі Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Сяргей Законнікаў, Генадзь Бураўкін, Ніна Мацяш, Леанід Дранько-Майсюк, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак і многія іншыя літаратары з Мінска і Берасця. Нядаўна прайшла чарговая вечарына памяці земляка – з удзелам барда Алеся Камоцкага і берасцейскага паэта Міколы Пракаповіча. Падчас яе ўпершыню былі ўручаны гімназічныя літаратурныя прэміі імя Нядзведскага тым вучням, якія найбольш праявілі сябе ў творчасці.

**Вадзім ЖЫЛКО**

ТУРНІР

# ЗГУЛЯЕМ У ШАХМАТЫ З ПІСЬМЕННІКАМІ?

**У кастрычніцкім выпуску «Літаратурнай Беларусі» (№8–9) распавядалася пра першы чэмпіянат па шахматах Саюза беларускіх пісьменнікаў і выказвалася ўпэўненасць, што распачатая традыцыя не знікне. Другі турнір запланаваны ў Мінску на 22–23 сакавіка (субота-нядзеля) і прымеркаваны да 90-х угодкаў БНР.**

Пераможцы будуць адзначаны прызамі і дыпломамі СБП (галоўную ўзнагароду згадзіўся вырабіць вядомы скульптар Алесь Шатэрнік). Тыя, хто жадае падужацца з калегамі-літаратарамі за чорна-белай дошкай, могуць папярэдне запісацца да ўдзелу ў чэмпіянаце па мінскім тэлефоне 261-22-65 (Васіль Аляксеевіч Жуковіч). Пра канкрэтнае месца правядзення турніру будзе паведамлена пазней.

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

# «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» – У БАБРУЙСКУ

**Чарговая прамоцыя «Літаратурнай Беларусі» прайшла 17 студзеня ў Бабруйску.**

У Бабруйскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася літаратурная вечарына з удзелам Міколы Аўрамчыка, Леаніда Дранько-Майсюка, Алеся Пашкевіча і Анатоля Санаценкі. Супрацоўнікі бібліятэкі да вечарыны падрыхтавалі адмысловую выставу з кніг названых аўтараў. Пісьменнікі чыталі свае вершы, эсэ, гаварылі пра беларускую літаратурную сучаснасць, пра непадкантрольныя незалежныя выданні – «Дзеяслоў» і «Літаратурную Беларусь». Прывезеных на прэзентацыю «з запасам» літаратурных газет нават не хапіла аматарам прыгожага слова.

У расчуленым выступе старэйшыны Міколы Якаўлевіча Аўрамчыка, які нарадзіўся на Бабруйшчыне, былі згадкі пра сваю маладосць, пра сённяшняе самапачуванне пісьменніка. Ён прачытаў некалькі сваіх вершаў – і лірычных, і гумарыстычна-гарэзных. Леанід Дранько-Майсюк гаварыў пра неабходнасць захавання беларускай культуры, згадваў сваю родную Давыд-Гарадоччыну і ейныя народныя святы, а свой «культурніцка-паэтычны» аптымізм выявіў у шчырым чытанні сваіх тэкстаў – і для дзяцей, і для жанчын (многія з прысутных у зале – найперш настаўніцы мовы і літаратуры – цыталі ягоныя «кветкавыя» вершы). На вечарыне выступіў паэт Анатоль Санаценка, вядомы бабруйчанам і як галоўны рэдактар мясцовай грамадска-палітычнай газеты «Бабруйскі кур'ер». Некалькі вершаў і «дзеяслоўнае» эсэ пра бульбу прачытаў Алесь Пашкевіч, да якога пытанняў на вечарыне задавалася найбольш: і пра ўласную творчасць, і пра дзейнасць Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Наогул, дыялог у зале быў вельмі актыўны (да аўтографаў падышлі праз тры гадзіны пасля яе пачатку): прысутныя цікавіліся як літаратурнымі, так і грамадска-палітычнымі пытаннямі – ад найбольш запатрабаваных «хітовых» сучасных тэкстаў да праблемаў функцыянавання і выжывання беларускай мовы ў роднай краіне і на дзяржаўным тэлебачанні.

Развіталіся з пажаданнямі новых сустрэчаў. А Бабруйск застаўся ў чаканні юбілею – 200-годдзя з дня нараджэння свайго слыннага земляка, пачынальніка новай беларускай літаратуры Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча...



Н.К.

# ЭДМІНАС БАГДОНАС: «ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ТРЭБА ВАЯВАЦЬ»

**15 студзеня ў пасольстве Літоўскай Рэспублікі ў Мінску адбыўся паказ дакументальнага фільма «Літва. Студзень, 13, 1991».**



Photo.ByMedia.Net

13 студзеня ў Літве — Дзень абароны Свабоды. 17 гадоў таму савецкая «краіна для народа» кінула сваіх салдат, танкі і бронетранспарцёры на бязбройных грамадзян, якія выйшлі на плошчы Вільні адстойваць сваё права «людзьмі звацца» і не дапусціць новай акупацыі. Літоўцы прыязджалі з розных гарадоў і вёсак, збіраліся каля парламенту, тэлецэнтру (які ноччу быў захоплены вайскоўцамі). Загінула 16 чалавек, больш паўтысячы было паранена.

Увекавечвалі той грамадзянскі чын не толькі народная памяць, але і кінадакументалісты. Танкі, зброя, савецка-імперская лютасць, прамовы абураных людзей, пахаванні герояў, кветкі ўдзячнасці, прэс-канферэнцыя вайскоўцаў (імі кіраваў генерал Усхопчык, які потым спакойна абжыўся на Беларусі ў рангу намесніка міністра)...

Надзвычайны і паўнамоцны пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас (які, як і многія цяперашнія кіраўнікі Летувы, быў удзельнікам згаданых падзеяў) у прамове перад паказам фільма адзначыў: «Незалежнасць проста так не даецца. За яе трэба ваяваць».

Ваяваць — і вучыцца помніць.

ЛІТПРАЦЭС

**На чарговай Радзе Саюза беларускіх пісьменнікаў былі абраныя 11 новых сяброў гэтай старэйшай творчай арганізацыі Беларусі. Пісьменніцкія пасведчанні атрымаюць А.Арашонак, А.Белы, У.Васько, П.Макарэвіч, А.Паўлухін, В.Ракіцкі, Д.Рубанік, П.Севярынец, А.Стадуб, А.Таболіч, А.Цвік. Ніжэй «Ъ» друкуе іх кароткія біяграфіі.**



**АРАШОНАК Ацём Яўгенавіч** нарадзіўся 27 ліпеня 1981 г. у Віцебску. Скончыў Віцебскі дзяржаўны універсітэт (па спецыяльнасці «нямецкая мова»). Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Наталлі Арсенневай (2003).

Друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях, калектыўным зборніку «12+1», альманаху «Дзвіна». Аўтар перакладу кнігі Германа Гесэ «Сідхартха» (2007). Піша прозу.

Рэкамендаваны ў СБП Віцебскім абласным аддзяленнем, Уладзімірам Папковічам, Сяргеем Рублеўскім.

**БЕЛЫ Аляксей Ілліч** нарадзіўся 2.01.1953 г. у в. Міхнавічы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобл. Пасля заканчэння школы №2 у Івацэвічах паехаў на Поўнач. Атрымаў спецыяльнасць штурман маламерных марскіх суднаў. Працаваў у Пінску памочнікам капітана цеплахода. З 1977 г. — у Баранавічах. Дырэктар-галоўны рэдактар ПУП «ІнтэксПрэс-Рэгіён».

Першыя вершы апублікаваў у 1971 г. у Карэліі. Друкаваўся ў абласных і рэспубліканскіх выданнях. Аўтар зборнікаў вершаў «Тридцать второе августа» (1994), «Невольничьи песни» (1997), «Каляровыя сны» (1999), «Боскі вецер правіцелі» (2002). Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў і Беларускага ПЭН-цэнтра.

Рэкамендаваны ў СБП Нінай Мацяш, Леанідам Галубовічам і Іванам Лагвіновічам.

**ВАСЬКО Уладзімір Гаўрылавіч** нарадзіўся 2 студзеня 1937 г. у в. Ліпічанка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобл. Скончыў Орлеўскую СШ,Гродзенскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў, працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў Дзятлаўскім раёне, у Дзятлаўскай і Лідскай раённых газетах . Жыве ў Лідзе.

Піша вершы і прозу. Друкаваўся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. Аўтар зборнікаў вершаў «Прасветленасць» (1981), «На схілах берагоў» (1997).

Рэкамендаваны ў СБП Юркам Голубам, Станіславам Суднікам і Аляксеем Пяткевічам.

**МАКАРЭВІЧ Пятро Рыгоравіч** нарадзіўся 15.04.1938 г. у в. Шынкі Крупскага раёна Мінскай вобл. Скончыў Шынкоўскую сямігодку і Бобрскую СШ. Служыў на Каўказе памежнікам. Закончыў бібліятэчны факультэт Мінскага педінстытута імя М. Горкага. Працаваў загадчыкам Лідскай раённай бібліятэкі, інструктарам РК КПБ. Пасля стацыянарнай Вышэйшай школы КДБ у Мінску служыў оперупаўнаважаным у г.Ліда. У знак нязгоды з карнарэпрэсіўнай палітыкай савецкай дзяржавы падаў рапарт на імя кіраўніка КДБ СССР. Уладкаваўся на працу на лакафарбавы завод. 27 гадоў адпрацаваў у «Лідскай газеце» і гарадскім радыё карэспандэнтам. Цяпер — на пенсіі. Жыве ў Лідзе.

Вершы і пераклады друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, альманаху «Братэрства» і інш. Аўтар зборніка вершаў «Злітак».

Рэкамендаваны ў СБП Уладзімерам Арловым, Анатолем Вярцінскім і Міхасём Скоблам.

**ПАЎЛУХІН Андрэй Аляксандравіч** нарадзіўся 10 снежня 1980 г. у г. Рагачоў Гомельскай вобл. Скончыў Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.Пушкіна. Працаваў бібліятэкарам, грузчыкам, трэнерам школьнай каманды КВЗ.

Проза друкавалася ў рэспубліканскіх выданнях. Аўтар кніг «Белополис» (2003), «Портал» (2005), «Электрычныя сны» (2006).

Рэкамендаваны ў СБП Барысам Пятровічам, Алесем Пашкевічам, Анатолем Івашчанкам

**РАКІЦКІ Вячаслаў** нарадзіўся 13 кастрычніка 1953 г. у м. Празарокі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл. У 1975 г. скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Працаваў загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, навуковым супрацоўнікам сектару тэатра Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук. Працаваў на Беларускім тэлебачанні, у часопісе «Спадчына» (рэдактарам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара і галоўным рэдактарам), выкладаў у вну Беларусі. Цяпер — на Радыё Свабода. Сябра Саюза тэатральных дзеячоў. Кандыдат філалагічных навук.

Аўтар шматлікіх крытычных артыкулаў у зборніках, часопісах і альманахах Беларусі і замежжа. Аўтар сцэнару дакументальнага фільма «Гульня ўсур'ёз» («Белвідэацэнтар»), кнігі «Беларуская Атлянтыда» (2006)

Рэкамендаваны ў СБП Вольгай Іпатавай, Уладзімерам Арловым, Сяргеем Законнікавым.

**РУБАНІК Дзмітрый Дзмітрыевіч** нарадзіўся 7.05.1972 г. у Магаданскай вобл. Працуе дызайнерам у газеце «Із рук в рукі». Кіраўнік дзіцячага тэатра. Жыве ў Віцебску.

Друкаваўся ў абласных і рэспубліканскіх выданнях. Аўтар паэтычных кніг «Просто стихи» (2002), «Одиночество по умолчанию» (2006).

Рэкамендаваны ў СБП Віцебскім абласным аддзяленнем, Давідам Сімановічам і Сяргеем Рублеўскім.

**СЕВЯРЫНЕЦ Павел** нарадзіўся 30 снежня 1976 г. у г. Ворша. У 1994 г. скончыў СШ №25 Віцебска, у 2000-м — геаграфічны факультэт БДУ. Працаваў рэпарцёрам у шэрагу дзяржаўных і камерцыйных выданняў. Лідэр незарэгістраванага «Маладога Фронту». Лаўрэат літаратурнай прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя А.Адамовіча.

Аўтар кніг «Ды-джэй Адраджэньня» (1998), «Пакаленьне Маладога Фронту» (2002), «Нацыянальная ідэя» (2005), «Лісты зь лесу» (2007), «Брату» (2007).

Рэкамендаваны ў СБП Міхасём Скоблам, Генадзем Бураўкіным і Уладзімерам Арловым.

**СТАДУБ Алесь** (Аляксандр Дзям'янавіч) нарадзіўся 24.04.1938 г. у в. Юнавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобл. Скончыў 10 класаў у Нясвіжы. Пасля службы ў войску закончыў Усесаюзны інстытут імя Крупскай (музыка, клас гармоніі). Узначальваў маладзёжны хор у Яраслаўлі. Там закончыў філфак педінстытута. Выкладаў у школе, працаваў у мясцовых газетах. У 1972 г. пераехаў у Ліду, дзе быў намеснікам старшыні таварыства «Веды».

Друкаваўся ў абласных і рэспубліканскіх выданнях. Аўтар кніг «Твае вочы» (1997), «Вузел (трыялеты)» (1998), «Споведзь натхненнем» (1999), «Летапіс пачуццяў» (2000), «Калінавыя гроны» (2001), «Сюжэт на фоне адвячорку» (2004), «Водгук ісціны» (2007).

Рэкамендаваны ў СБП Данутай Бічэль, Юркам Голубам і Станіславам Суднікам.

**ТАБОЛІЧ Алена Уладзіміраўна** нарадзілася ў в.Горна Зэльвенскана раёна Гродненскай вобл. «перад Вялікаднем». Скончыла Зэльвенскую школу, Мінскі інстытут замежных моў. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Перакладае з англійскай мовы.

Аўтар кніг перакладаў «Срэбны дождж» (1999), «Ліхтарык глогу: пераклады» (2006), «Ryhor Baradulin. Ksty (пераклады)» (2006) і дапаможнікаў для студэнтаў.

Рэкамендаваны ў СБП Рыгорам Барадуліным, Лявонам Баршчэўскім, Пятро Васючэнкам і Сяргеем Панізьнікам.

**ЦВІК Алесь** (КАВАЛЁЎ Алег Васільевіч)нарадзіўся 31 жніўня 1947 г. у г. Ліда Гродненскай вобл. Закончыў Мінскае музычнае вучылішча, Інстытут замежных моў. З 1996 г. жыве і працуе ў Нямеччыне.

Аўтар кніг прозы «Палитра» (2002), «Палитра-2» (2003), «Свобода в целлофане» (2004).

Рэкамендаваны ў СБП Алегам Лойкам, Лідзіяй Савік, Васілём Якавенкам і Валерам Санько.

ІДЭЯ

# САЛОМІНКА

Алег АБЛАЖЭЙ, www.vilnia.com

**Беларуская літаратура заўсёды, у самыя цяжкія для існавання нацыі часы, «звала з путаў на свабоду, з цемры да святла». Але ніколі яшчэ за ўсю гісторыю Беларусі яна не несла такога цяжару адказнасці за лёс свае краіны, як цяпер.**



Разгромлены Саюз пісьменнікаў; ледзь выжывае адзіны незалежны беларускамоўны літаратурны часопіс «Дзеяслоў»; беларускія кнігі выходзяць мізэрнымі накладамі, але й тыя пыляцца ў кнігарнях; творы найлепшых аўтараў выкідваюцца са школьных хрэстаматыяў. Ды ўвогуле чытацкая аўдыторыя скарачаецца, бы чыгрынавая скура, бо не чытаюць не толькі па-беларуску, але й на іншых мовах. У краіне ўсталяваўся непахісны, як жалезабетон, рэжым, які ненавідзіць усё беларускае.

І гэта — надоўга.

Нядаўнія падзеі ў Бірме, гісторыя Паўночнай Карэі, Кубы сведчыць: сучасная цывілізацыя распісалася ў сваёй бяссільнасці, немагчымасці хоць якога дзейснага ўплыву на падобныя рэжымы. Беларусь ахутала цемра.

І большасць ужо настолькі да яе прызвычаілася, што лічыць яе ясным днём.

Беларусі не дапаможа ніхто звонку. Яна павінна да дна выпіць горкую атрутную чару, наканаваную лёсам.

Канчатковы лёс Беларусі — быць ёй ці не быць, заняць «свой пачэсны пасад між народамі» ці знікнуць, як няўдалы «праект», прывід, утопія, — вырашаецца менавіта цяпер. Сёння.

Былі й раней — захопы, войны, акупацыі, русіфікацыя і паланізацыя. Але народ заставаўся. «Цёмны, сляпы, быццам крот» — але быў. У вёсцы.

Бо ўсім уладарам, захопнікам, панам і чыноўнікам было па вялікім рахунку напляваць, на якой мове гавораць дзед з бабаю на печы ці якімі словамі дзяцюк уговорвае дзеўку на капе сена.

Сёння вёскі, беларускай вёскі — больш няма. Знікла гэтая апошняя жывая крыніца, апошні прытулак, апошняе сховішча беларускай мовы.

Беларускай мове здрадзілі ўсе — шляхта, рэлігія, якая стала «рускай» і «польскай», навучальныя ўстановы, навукоўцы. І вось, нарэшце, і вёска.

Але засталася апошняя іскрынка, апошні вугалёк, што свеціць у непраглядным цемры — беларуская літаратура.

Толькі з гэтага вугалька можа ўспыхнуць полымя, з якога адродзіцца беларускі Фенікс.

Навука, тэхніка, бізнэс, адукацыя могуць паспяхова існаваць у любым моўным асяроддзі. Толькі беларуская літаратура не можа вырачыся беларускага слова — бо тады проста перастане існаваць. У гэтым яе адчайная моц. Нават самая безабаронная істота, загнаная ў кут, знаходзіць у сабе нечаканыя сілы для супраціву. Нават самы вялікі мінус становіцца плюсам, калі яго рашуча перакрэсліць.

Літаратура — гэта саломінка, за якую хапаюцца, каб не патануць у чужой дрыгве.

Перачытайце «Пана Тадэвуша» або яшчэ лепей — перагледзьце аднайменны фільм, — нас там няма. Ані знаку. Не тое, што слова — акцэнта беларускага. Хоць дзея адбываецца на беларускай зямлі.

Што б мы рабілі, чым бы засведчылі — мы ёсць, мы — тутэйшыя, гэта — наша зямля, — калі б не «Новая зямля»?..

Адраджэнне Беларусі магчымае толькі вакол Слова. Або яго не будзе зусім.

Наш супраціў — гэта не ломка, не разбурэнне. Не разбураць, а будаваць. Адбудоўваць. Цярпліва, па каменьчыку, па бярвенцы, па слоўку.

Моц літаратуры — ва ўсведамленні ўласнай місіі, ва ўнутраным імпэратыве.

Усё можна прывезці з-за мяжы — ад тэхналогіяў да джынсаў. Толькі літаратуру — сваю, родную — могуць стварыць выключна самі беларусы, у сваёй краіне.

І — стварыць саміх сябе.

А слова — заўсёды было пачаткам.

ГРАМАДА

Новы год стаў годам нараджэння новага грамадска-культурнага сайта «Мы — нацыя!» (www.nation-sos.info) — своеасаблівага віртуальнага інстытуту нацыянальнай гісторыі, будаўніцтва і бяспекі. «Шаноўныя суайчыннікі! Народжаны акурат пад гэты Новы год сайт «Мы — нацыя!» выказвае сваю шчырую радасць з выпадку свайго своечасовага з'яўлення на свет сярод цікаўных і нястомных наведвальнікаў і самога народа, дасціпнага, чыннага, які трохі падбіўся на няроўным, пакручастым гістарычным шляху між Усходам і Захадам. Гэтаму народу — бачыць Бог — я вельмі і вельмі патрэбны. Вітайце мяне, а я зычу ўсім Вам добрага здароўя, даўгалецця і поспеху ў ратаванні нацыянальных каштоўнасцей — мовы, культуры, дзяржаўнасці! Усяго таго, без чаго самавіты народ прападзе. Мы — нацыя!», — гаворыцца ў сайтавай «перадавіцы».

Сярод задачаў сайта пазначаны наступныя: «вывучаць, выяўляць і паказваць людзям усе бакі і напрамкі, па якіх ідзе разбурэнне НАЦЫІ; заклікаць здаровыя сілы грамадства да супрацьдзеяння духоўнаму распаду з мэтай яго стрымлівання і абуджэння душы беларуса да актыўнай творчасці; выяўляць і паказваць напрамкі пазітыўнай працы ў сцвярджэнні патрыятычнага духу людзей, у стварэнні і прапагандзе нацыянальных каштоўнасцей, ва ўзняцці гонару за свае спадчынныя скарбы, культуру, мову, традыцыі; глыбей і настойлівей аналізаваць старонкі гісторыі, <…> не абыходзячы пільнай увагай фізічны і духоўны генацыд беларускай НАЦЫІ, які доўжыцца з мінулых стагоддзяў аж у сённяшні дзень; абуджаць нацыянальную свядомасць...».

У сайтавым акне «Творы» ў PDF-версіі можна азнаёміцца з выпускамі «Літаратурнай Беларусі».

У сваю чаргу нашае выданне публікуе артыкул галоўнага рэдактара сайта «Мы — нацыя!» пісьменніка Васіля Якавенкі, у якім закранаюцца пытанні народа, нацыі і дзяржавабудавання.

# НАРОД І НАЦЫЯ

Васіль ЯКАВЕНКА

**Шаноўныя, перад вамі спроба адкрытай і шчырай размовы пра найбольш важнае і надзённае, што востра стаіць перад нашым народам, цяпер — асабліва: ратаваць сябе ў супольнасці, у суладдзі, берагчы і развіваць творчы дух народа і нацыі.**



Я ведаю, што гэтыя словы і тое, што за імі стаіць, дойдзе далёка не да кожнага розуму, не да кожнага сэрца, таму пачну ab ovo, што значыць з яйка, як казалі некалі рымляне.

А каб лепей уявіць сабе прадмет нашай размовы, прыбегнем да параўнання. Зробім гэта, ставячы ў думках перад сабой два словы-паняцці — НАРОД і НАЦЫЯ. Яны блізкія па значэнні, больш за тое, імі часам карыстаюцца як сінонімамі. Тым не менш, калі ўявіць іх аб'ёмна, скажам, як своеасаблівыя збудаванні адналькавай формы, і прыдаць ім далей знакавую

> Няма нацыянальнай ідэі — буцвее і рушыцца вабны раней высокі дах, і няўтульна; самавіты народ спакваля перятвараецца ў шараговае насельніцтва, у абмежаваны статак, абыдляецца; ён, годны і разумны раней, не знаходзіць, на што душой абаперціся, а «чарка і шкварка», пра якую з пераменным поспехам дбае з году ў год вертыкаль, не ўздымае высакародных пачуццяў

сутнасць, якую для гэтакіх форм і паняццяў прадугледзела матухна-прырода, то разам з падабенствам і роднасцю паміж імі стане ўжо відавочнай і вялікая розніца.

Прынамсі, першую форму мы павінны пакінуць без усялякай адмысловай надбудовы, і гэта будзе НАРОД, у той час як нашанскае другое збудаванне ўжо вымагае даху, які хутчэй за ўсё завершыцца купалам, і тады ўсё, узятае разам, будзе адпавядаць вызначэнню НАЦЫЯ. Само сабой, гэтакая рэч перагворыцца з дома без даху ў гожы храм, вялікі ці малы, у сталы прытулак, дзе месціцца ды вольна жыве дасціпны народ, а з ім і дух ягоны.

Адухоўленае жыццё НАРОДА матэрыялізуецца ў дыялектычным і бясконцым развіцці ягонай гісторыі, культуры, мовы, веры, еднасці, псіхічнага стану, традыцый.

Значыць, шаноўныя, замацуемся на думцы: НАРОД фізічна мае тое ж цела, масу, займае тую ж прастору на зямлі, адно ўяўляе сабой параўнальна штосьці менш дасканалае ў сваёй супольнасці, больш прыземленае, прыгнобленае, даруйце, у той час як НАЦЫЯ — гэта ўсё-ўсёсенькі, узятае разам з тым, што сягае ўгору.

Нацыя мовай вышэйшых матэматычных вылічэнняў — няйначай, мае чацвёртую каардынату, а менавіта — дух, самадастатковы дух народа, апроч тых трох вымярэнняў у фізічнай прасторы, у якіх бытуе народ.

Скажам і так: Нацыя — гэта народ, які ў гістарычным калаўроце не пазбыўся сваёй духоўнай культуры і мовы.

Дзіва, праз якія нягоды прайшла, усталёўваючыся, нашая ліцвінска-беларуская супольнасць! А цяпер — новая небяспека, якой ніхто і прадказаць не мог: САМАЛІКВІДАВАННЕ. Прынамсі, так гэта выглядае. І, калі яно так, то чаму гэта здарылася?

Пачалося, няйначай, з укаранення нейкага дзівоснага антыцела ва ўладу, якім зачата і пайшла ўтварацца пухліна. Гэта мой асабісты погляд. Цяпер з благаслення і па ініцыятыве вышэйшых асоб у дзяржаве, якія не засвоілі з малых гадоў і не ведаюць, што такое нацыя, ідзе яе разбурэнне. А пошук нацыянальнай ідэі — гэтай таямніцы, якую высокія адказныя асобы нібыта «шукалі» колькі гадоў на беларускай зямлі, не ўздымаючы вачэй вышэй свайго носа, натуральна зразумела, не даў выніку і замест купала, у якім спалучаюцца, сыходзячыся, усе нацыянальныя нерукатворныя каштоўнасці, мясцовыя недарэкі заснавалі «вертыкаль», што ў пэўным сэнсе вышэй за Астанкінскую вежу, і пад яе ўжо — «дзяржаўную», так бы мовіць, ідэалогію, якая і дагэтуль не склалася.

Пра нацыянальнае будаўніцтва размовы няма. Яе, размовы, пакуль што і быць не можа, бо, паўтаруся, поўным ходам ідзе разбурэнне НАЦЫІ, яе інстытутаў, духоўных каштоўнасцей, якія ўтваралі і ўтвараюць залаты купал над суверэннай краінай.

Няма нацыянальнай ідэі — буцвее і рушыцца вабны раней высокі дах, і няўтульна; самавіты народ спакваля перятвараецца ў шараговае насельніцтва, у абмежаваны статак, абыдляецца; ён, годны і разумны раней, не знаходзіцца, на што душой абаперціся, а «чарка і шкварка», пра якую з пераменным поспехам дбае з году ў год вертыкаль, не ўздымае высакародных пачуццяў, балазе яны, пачуцці, у душы здратаваны мінулымі дзесяцігоддзямі.

І намаляваная тут схема — не жарт. Менавіта па ёй ідзе развіццё, толькі цяпер у адваротным кірунку, што характарызуецца ўжо іншым словам — распад.

Дык ці не варта нам, шаноўныя-любыя суродзічы, беларусы, біць у званы, і гучна біць, і доўга біць, бо мы страчваем самае дарагое, што пакуль яшчэ ў нас ёсць, — душу, а з ёй і сябе, зямлю, а з ёй і Айчыну.

Неяк у Федэральнага прэзідэнта Германіі Іаганэса Рау спыталі людзі старэйшага пакалення: «Скажыце, што мы павінны перадаць сваім дзецям?». І ён адказаў: «Скажыце ім пра тое, што, выпраўляючыся ў іншыя краіны, важна мець радзіму ўнутры сябе. Таму што ў таго, хто не мае дома, не можа быць і суседзяў»...

ФАКТАСЛОЎ

# БЕЛАРУСЫ НЕ ХВАРЭЛІ НА БАЛЬШАВІЗМ

Віктар ХУРСІК

**Споўнілася 90 гадоў падзеям, што прывялі Расійскую імперыю да распаду. У тысячах тамоў зафіксаваныя падзеі і факты крывавых дзён 1917-га, зробленыя адпаведныя, часам супрацьлеглыя, вывады. І, тым не менш, новае чытанне некаторых дакументаў тых часоў дае падставу для разважанняў…**



«Мёртвыя — не баяцца»

Асноўнай палітычнай плынню на Беларусі да лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. была нацыянальная сацыял-дэмакратыя. Яна яднала погляды шматлікіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі, служачых, вайскоўцаў, абшарнікаў, іншых слаёў насельніцтва. Сялянства ў палітычным жыцці амаль не ўдзельнічала. Што тычыць рабочых, дык іх колькасць была нязначнай, яны не мелі сваёй нацыянальнай палітычнай арганізацыі і поўнасцю выхоўваліся заезджымі эмісарамі з Расіі. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, бальшавікам не ўдалося дамагчыся значных поспехаў у «Паўночна-Заходнім краі».

Супрацьстаянне наймальнікаў і рабочых на беларускай глебе не давала тых вынікаў, на якія разлічвалі бальшавікі. У 1908 годзе на машынабудаўнічых заводах «Якабсон, Ліфшыц і Ко» адбылася буйнейшая забастоўка. Мінскія бальшавікі падштурхнулі на яе з прычыны зніжэння расцэнак. Аднак адміністрацыя правяла з забастоўшчыкамі перамовы, растлумачыла свой крок, і ў выніку рабочыя прыступілі да працы. Гэта быў, бадай, адзіны выпадак, калі беларускія рабочыя паддаліся на правакацыю. Толькі скарыстаўшы цяжкасці вайны 1914 года бальшавізм запанаваў на Беларусі. Краіна была падзеленая лініяй фронту. На захад ад яе ўчынялі гвалты, рабавалі і нішчылі насельніцтва немцы. На ўсходзе — расійскія вайскоўцы. Баючыся здрады, яны прымусова высялялі беларусаў з прыфрантавой паласы…

Звернемся, да ўспамінаў М. Бялеўскай (Лецягінай), якая жыла ў Магілёве падчас знаходжання там Стаўкі і пакінула горад з прыходам бальшавікоў. Заўважым, што ва ўспамінах гэтай жанчыны бальшавікі недвухсэнсоўна падаюцца як навала, прышлая звонку, з-за межаў Беларусі:

«Бальшавіцкі пераварот нікога ў Магілёве не ўразіў.

Адным з першых быў арыштаваны ксёндз князь Святаполк-Мірскі.

Справа ксяндза была прызначана да слухання ў гадавіну перавароту 28 лютага (1918 года. — Аўт.) у зале жаночай гімназіі…

Усе сядзелі спакойна і чакалі з'яўлення ксяндза. І вось — адчыніліся дзверы, і ўсе ўбачылі, што на ганку залы стаіць ксёндз у акружэнні салдат, а дакладней — цень ад таго ксяндза, якога магілёўцы так добра ведалі...

Мы… паднялі неверагодны гвалт і з праклёнам кінуліся на ўзброеных з ног да галавы чырвонаармейцаў. Тыя пачалі патрабаваць, каб мы змоўклі, але мы крычалі без памяці... і ратпам пачуўся стрэл.

Мы ўсе апусціліся на падлогу.

...Калі бальшавікі расстралялі ўсе патроны і загадалі ўсім нам падняцца, то ксяндза ўжо ў зале не было... На падлозе ў лужынах крыві ляжала некалькі паміраючых жанчын, многія былі параненыя, я нейкім цудам уцалела хаця сядзела ў першым радзе і маё паліто і сукенка былі прастрэленыя ў трох месцах.

…Труп ксяндза, знявечаны бальшавікамі, праз некалькі дзён ляжаў ў канаве за горадам».

Большая частка беларусаў не вітала кастрычніцкі пераварот і з жахам сачыла за разгортваннем падзей. Публікацыі ў беларускіх газетах, якіх яшчэ не кранула тады бальшавіцкая цэнзура, пацвярджаюць гэта. Вось некаторыя з тых нататак, якія пабачылі свет адразу пасля кастрычніцкага перавароту:

«М. Лунінец. 9 лістапада [1917] губ. камісарыят атрымаў тэлеграму з Лунінца, што разгромлены маёнткі: «Маньковічы», кн. Радзівіла і «Лунін» кн. Друцкага-Любэцкага».

У гэтым паведамленні яшчэ няма звестак аб тых, хто робіць пагромы. Але чуткі вірують. Землеўласнікі выказваюць меркаванні адно страшней другога. І яны спраўджваюцца. Праз колькі дзён з'яўляюцца падрабязнасці:

«Пагромы ў паветах.

У Мінск штодня надыходзяць весткі аб пагромах у паветах. На пачатку лістападу разгромлены і часткаю папалены маёнткі: «Глінін» на Барысаўшчыні, «Грушына» на Ігуменшчыні, «Слабодка» на Браслаўшчыні, «Труханы» на Навагрудшчыні, «Трахомск» на Піншчыні, «Калюніца», «Крушчына», «Камокі» на Ігуменшчыні…».

Перад бальшавікамі ўсе роўныя:

«Хутар Арэхова. Радчыцкай вол. Мін. пав.

Чатыры нівядомыя салдаты зайшлі ў хату Качана і кінулі бомбу. Бомба раніла гаспадара, яго ўнукаў і чужога хлопчыка. Салдаты абшарылі хату і, угледзіўшы, што нічога німа, пайшлі сабе спакойна».

Каб зразумець страх і роспач беларусаў ад такіх паведамленняў, трэба адзначыць наступнае. Лютаўская рэвалюцыя была сустрэта імі з разуменнем. Рашэнні Часовага Урада выконваліся. Дзейнічалі Саветы, у якіх былі прадстаўленыя самыя розныя часткі насельніцтва. Працавалі фабрыкі, вёўся гандаль, збіраліся падаткі. Там, дзе не стаяў фронт, была паспяхова праведзена пасяўная кампанія (у тым ліку і ў маёнтках землеўласнікаў). Праўда, дзе-нідзе сяляне выказвалі незадавальненне, але гэта большай часткай былі эканамічныя патрабаванні, звязаныя з пашырэннем карыстання лясамі, лугамі, сенажацямі. Ніякіх патрабаванняў накшталт «Земля — крестьянам!» на беларускіх гонях тады не гучала. Ды і не магло гучаць па той простай прычыне, што беларусы заўсёды свята паважалі права асабістай уласнасці. У архівах і цяпер захоўваецца шмат дакументаў, якія сведчаць аб куплі-продажы зямлі сялянамі як да перавароту, так і пасля яго. І вось з'яўляецца бальшавізм — ідэалогія, якая пераўтварае чалавека ў драпежніка. І беларусы даюць ёй ацэнку. Далёкую ад той, якой доўгі час нас зводзілі ў зман:

«Вар'яты.

Сяляне Вітабскай губ. паслалі ў Петраград дэлегацыю шукаць правасудзья. Справа ў тым, што селяне трох суседніх вёсак захапілі ў траўні сялібу велічынёю 18 дзесяцін некага пана Новакоўскаго, але падзяліць яе да гэтага часу ні маглі. Пашлі сваркі і пабоішчы. У рэзультаці — за 18 дзесяцін зямлі 14 чалавек забіто, 36 чалав. пакалечана на векі і 70 чал. проста зранены, ні лічучы ужо матэрыяльных страт для усіх трох вёсак. Рабілася гэта у Невельскім павеці на Вітэбшчыні. Кажуць, што ні знайшоўшы сабе парады у Петраградзі, дэлегацыя пашыбавала ў Стаўку. Ну ці ні вар'яты гэта?»

Як вар'яцтва ацэньвалі беларусы кастрычніцкі пераварот і яго наступствы. Іншая рэч, што супрацьстаяць прышлай навале не было ніякіх магчымасцяў — нацыянальныя палітычныя партыі толькі набіралі моц, беларускай дзяржаўнасці не існавала, не было свайго войска. На месцах панавала разгубленасць. Кіраўнікі многіх мясцовых органаў улады (на той час — Саветаў, падкантрольных Часоваму Ураду) не ведалі, што сама Беларуская Рада — орган кіравання незахопленнымі ворагам губернямі Паўночна-Заходняга краю — была бальшавікамі без прамаруджання звергнута, яны спадзяваліся на часовасць бальшавікоў, верылі, што ў Менску робяцца захады па выпраўленню сітуацыі, звароту законнай улады:

«Покліч да Беларускай Рады.

Слуцкі павятовы камісар звярнуўся да Рады з гэтакай тэлеграмаю: «Становішчо у павеці труднае. Прышлы элямэнт з Валогды, Вяткі, Костромы і інш. м. уселякімі абецанкамі верадуюць маласьвядомыя, а то і саўсім нісьвядомыя масы. Пачаліся пагромы маёнткаў салдатамі, разгромляны хвальбаркі: Малево, Альба і Робертаво, што каля Нясьвіжу. З Слуцкае Рады с. і р. дэпутатаў павыходзілі ўсе мейсцовы людзі, прэдстаўнікі усіх социялістычных партый, засталіся большэвікі. Яны склікалі т. з. селянскі зьезд, нівядома праз каго дэлегаваны. На гэтым зьездзі ухвалено арыштаваць камісара Астроўскаго, начальніка міліцыі Асьвецімскаго і др. ўсіх сябрукоў беларуск. сацыяліст. грамады. Покі што мы ні арыштаваны і пастановам безадпаведальных людзей ні скарымся, калі ні будзе ужыта фізычнае сілы.

Наша думка: Вялікая Беларуская Рада павінна нібаўна узяць уладу ў краю у свае рукі, бо на праціўны выпадак, знішчацца усё культурнае багацце краю.

Слуцкі камісар».

Гэтыя радкі ўзятыя з газеты, датаванай 19 лістападам 1917 года. Прайшло ўжо амаль два тыдні пасля «поддержанного белоруским народом» перавароту ў Петраградзе, а беларусы на месцы яшчэ спадзяваліся, што чужаземная навала абміне край.

Не абышла. і тыя «прышлыя элементы з Валогды, Вяткі і Кастрамы», апіраючыся на айчынных бандзюг, з п'янай галавы пачалі ўсталёўваць «пролетарский порядок»:

«29 лістапада ў Мінску каля 8 гадзін у вечар натоўп салдатаў, даведаўшыся, што на ст. Александроўск. ж.д. прышлі цыстэрны с спірытусам, кінуўся на іх, каб разграміць і расхватаць спірытус. іх запынілі. Началася страляніна, падчас каторай аднаго чалавека паранілі».

Газета, якая надрукавала гэты артыкул, літаральна праз тры тыдні паведаміла аб больш значным «геройстве» п'яных бальшавікоў: імі з дапамогай зброі быў разагнаны ў Менску Усебеларускі з'езд — законны орган, які аб'явіў аб пераходзе ўлады на Беларусі да беларусаў...

Пасля снежаньскіх падзеяў у Менску, як і па ўсёй нашай шматпакутнай краіне, бальшавікі ўсталявалі тэрор, рабавалі і адбіралі тое, што цудам уцалела ў час вайны. Ніякай гаворкі аб задавальненні надзённых патрэбаў насельніцтва не вялося. Пачатак 1918 года быў азмрочаны крывавай расправай у беларускай сталіцы. 2 студзеня даведзеныя хлебным голадам да адчаю гараджане рушылі да харчовага камітэта. Натоўп сустрэлі верныя бальшавікам салдаты-тэкінцы. Пачалася бойка і страляніна: аднаго чалавека забілі, чатырох паранілі:

«Стрэляніна моцна ўзбурыла горад. Стрэлялі галодных людзей пры маскоўскіх царох...

Менск — сэрцо Беларусі без хлеба. Горад ні прыбіраецца. Па вуліцах прайсьці трудна. Тратуары, як каўказскія горы.

О, Беларусь! Ці доўга яшчэ будуць гаспадарыць у нас чужынцы, абярнуўшыя гарадэ нашыя ў галодныя пустэлі?!

Калі ж кончыцца гэты праклятый прыгон...» — так пісаў у адной з газет вядомы тагачасны беларускі журналіст, публіцыст, класік нацыянальнай літаратуры Кузьма Чорны.

Зразумела, помніка забітаму гараджаніну чужынцы не ўзвялі. Галоднага, даведзенага да адчаю вайной і рабункамі, яго, хутчэй за ўсё, абвінавацілі ў адсутнасці пралетарскай свядомасці…

Вяртаючыся да тэмы 90-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, выкажу думку, што рэвалюцыя не была інтэрнацыянальнай. Беларусы (маюцца на ўвазе як легальныя палітычныя дзеячы ў Думе, так і працаўнікі на нелегальным становішчы, члены нацыянальных партый), а тым больш простыя працаўнікі ніколі не заклікалі да ўзброенага выступу. Не вінаватыя беларусы і ў развязванні грамадзянскай вайны. Толькі адзін вядомы факт: калі нашаму земляку, генералу Васілю Гурку (які ў 1916-1917 гг. выконваў абавязкі начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага) у час эміграцыі англічане прапанавалі ўзначаліць белы рух, ён катэгарычна адмовіўся. Выдатны палкаводзец, які быў у зносінах з Мікалаем II і які, нягледзячы на гэта, падтрымліваў неабходнасць пераменаў у грамадстве, выступіў супраць вайны з народам…

Уся дзейнасць тагачасных беларускіх нацыянальных палітычных партыяў і плыняў была скіраваная да памяркоўнага, паступовага пераходу беларускага грамадства да дэмакратычнага развіцця. Гэта было заўважана і адзначана самімі бальшавікамі: «Белорусские буржуазные националисты в газете «Наша нива», сообщая о начавшемся после ленских событий массовом рабочем движении, выражали крайнее сожаление, что «рвется мирная творческая работа», ктороя якобы существовала в годы столыпинщины. Они ненавидели революцию, называли ее «завирухой», боялись народного движения», — пісаў у 1972 годзе Ц. Саладкоў у кнізе, падрыхтаванай Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ, «Большевистская газета «Правда» в Белоруссии».

Страты і пакуты расійскага народа пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі невымерныя. Але і наша нацыя тады сербанула гора. У час захопу бальшавікамі ўлады пралілося шмат беларускай крыві. Ды кроў тая пралілася не ў падтрымку рэвалюцыі, а якраз з-за яе адмаўлення...

# ТАЙНАЯ ПАЛІЦЫЯ

## П'ЕСА-АНЕКДОТ

Анатоль САНАЦЕНКА

**«Цяжка, думаю, ставіцца з большай абрыдлівасцю, чым я, да кроваправіцця, але яшчэ больш цяжка пераўзысці маю агіду да самой прыроды таталітарных дзяржаваў, дзе разня ёсць толькі дэталь адміністратыўнага кіравання».**

**Уладзімер Набокаў**




### Дзеючыя асобы:

**Сухарукаў** (мянушка «Цэнтральны»), начальнік тайнай паліцыі.

**Землякоў** (мянушка «Жмурык»), ягоны намеснік. Любімая фраза Землякова: "Я з вамі ў хованкі гуляць ня буду!»

**Разяеў** (таксама Шмурыгін, мянушка «Жучок»), аператыўны (вельмі аператыўны) супрацоўнік.

**1-ы афіцэр.**

**2-і афіцэр.**

**Аляксандр,** Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР

**Кіраўнік спецслужбаў суседняй дзяржавы.** Гаворыць мяккім голасам, увесь час усміхаецца.

**Журналіст N.**

**Ірына Міхайлаўна.**

**Пацук.**

Дзея адбываецца на пачатку XXI-га стагоддзя ў адной з усходнееўрапейскіх краінаў, якая ўсё яшчэ працягвае мроіць «залатыя сны» камунізму.

Кабінет Сухарукава, аздоблены чырвоным дрэвам. Пасярэдзіне — вялікі стол. На стале — бюст Дзяржынскага, графін з вадой і перакідны каляндар. Абапал стала яшчэ два сталы крыху меншых. На сцяне за сталом — партрэт правадыра з добрай усмешкай. Справа — вялікая жалезная шафа, злева — уваходныя дзверы. За сталом сядзіць і нешта па-ленінску хутка піша Сухарукаў. Уваходзіць Землякоў, у руках у яго лапата.

**Землякоў.** Дазвольце?

**Сухарукаў** *(адрываецца ад пісаніны, глядзіць па-над акулярамі).* Уваходзьце, уваходзьце, Аляксандр Васільевіч. Прысаджвайцеся. *(Глядзіць на лапату).* На дачку?

**Землякоў.** Не, вы памыліўся, Аляксандр Мікалаевіч, апазіцыю іду закопваць!

*(Абодва весела і радасна смяюцца.)*

**Сухарукаў.** Дарэчы, як там наш Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР? Ад Жучка звестак няма? Можа — ужо?

**Землякоў.** Дай Бог! Мінулы раз мы так аблажаліся, так аблажаліся!

**Сухарукаў.** І не гаварыце. Адным словам — Разяеў... *(Абодва смяюцца).* Відаць, наш Жучок у панядзелак нарадзіўся: то бомбы ў яго не выбухаюць, то зброя не страляе, то атрута вычхаецца....

**Землякоў.** А з машынай гэта было добра прыдумана. Пустынная загародная шаша. Наезд. І ніводнага сведкі! Такі шанц змарнавалі!

**Сухарукаў.** Шкада... Хто б мог падумаць, што ў Разяева машына зламаецца?

**Землякоў.** А калі і на гэты раз мы не атрымаецца, што будзем рабіць?

Сухарукава нервова перакрыўлівае.

**Сухарукаў.** Накрэчаш, Васільевіч... Не выканаць ягоны загад *(ківае на партрэт за сьпіной)* — падпісаць прысуд сабе самому...

Асцярожны стук у дзверы. Уваходзіць Разяеў.

**Сухарукаў, Землякоў** *(разам).* Ну, што, як?

**Разяеў** *(вінавата, сумным голасам).* Ён не выйшаў з дому. Відаць, нешта адчуў. Давялося адмяняць аперацыю, вяртаць людзей у лагер...

**Сухарукаў.** А каб цябе, Віктар Мікалаевіч...

**Разяеў.** Што я мог зрабіць? Праседзелі ў засадзе цэлы дзень. З калоніі пачалі тэлефанаваць: аддайце тое, што ўзялі, едзе начальства. Давялося зварачвацца.

**Сухарукаў.** Вы яго па тэлефоне выклікалі?

**Разяеў.** Выклікалі.

**Сухарукаў.** У дзверы званілі?

**Разяеў.** Званілі.

**Сухарукаў.** Аднакласніка былога падсылалі?

**Разяеў.** Падсылалі.

**Сухарукаў** *(у роспачы).* Каб цябе, Віктар Мікалаевіч!..

Уваходзіць 1-ы афіцэр.

**1-ы афіцэр.** Дазвольце, Аляксандр Мікалаевіч?

**Сухарукаў** *(з раздражненнем).* Так. Што ў вас? Гаварыце.

**1-ы афіцэр.** Паводле пэўных дадзеных, Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР у дадзены момант знаходзіцца ў горадзе Александрыйску.

**Сухарукаў.** Што-о-о-о-о! *(Ускоквае.)* Хто дазволіў! Хто пасмеў! (Раззяеву гнеўна). Прашляпіў, разява! *(1-му афіцэру.)* Як доўга ён там знаходзіцца?

**1-ы афіцэр.** З мінулага дня.

**Сухарукаў.** *(Разяеву з'едліва).* Дык каго ж вы там пільнавалі, каго выклікалі, каму ў дзверы званілі?

**Разяеў.** Адрас дакладны, 1-ы тупік Леніна, дом пяць...

Паўза. Сухарукаў глядзіць у нататнік.

**Сухарукаў** *(рэзка падскоквае).* Разяеў!

**Разяеў.** Я, Аляксандр Мікалаевіч!

**Сухарукаў.** Скажу вам, не ў службу, а ў дружбу: вы дасканала адпавядаеце свайму прозвішчу. Дакладны адрас: не ПЕРШЫ, а ДРУГІ тупік Леніна!

**Разяеў.** Але ў дакументах....

**Сухарукаў.** Ідзі. Вон з вачэй. *(Налівае шклянку вады з графіна).* Заяву на стол! Мне досыць! *(П'е ваду.)*

Разяеў выходзіць, сутыкаецца ў дзвярах з 2-ім афіцэрам.

**2-і афіцэр.** Дазвольце, Аляксандр Мікалаевіч? Тэрміновая справа.

**Сухарукаў** *(нервова).* А што ў вас?

**2-і афіцэр.** Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР ідзе па калідоры Дэпартамента.

Паўза.

**Сухарукаў** Якога Дэпартамента?

**2-і афіцэр.** Нашага Дэпартамента.

**Сухарукаў.** Нашага?

**2-і афіцэр.** Дакладна так.

**Сухарукаў** *(1-му афіцэру).* Вы ж казалі, ён у Александрыйску. Як такое можа быць: і тут і там — адначасова.

**1-ы афіцэр** *(разводзіць рукамі).* Не магу ведаць. *(З таямнічым выглядам.)* АПАЗІЦЫЯ!

**Сухарукаў.** Містыка нейкая... Добра, няхай ён будзе тут. (2-му афіцэру). Куды ён накіроўваецца, вы можаце сказаць?

**2-і афіцэр.** Да вас.

**Сухарукаў.** Так, добра, ён ідзе да мяне. А хто яго прапусціў? Дазвольце пацікавіцца.

**2-і афіцэр.** Ён паказаў пропуск, падпісаны вамі. На словах патлумачыў, што вы яго запрашалі прыходзіць у любы час.

**Сухарукаў** *(Землякову).* Я запрашаў?

**Землякоў.** Вы запрашалі.

**Сухарукаў** *(азадачана).* Я запрашаў....

Стук у дзверы. Паўза. Ізноў стук.

**Сухарукаў.** У-уваходзьце.

Уваходзіць Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР. Услед за ім у кабінет нячутна прасочваецца Разяеў, які трымае ў руцэ аркуш паперы.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Я маю да вас справу.

Усе прысутныя, апрача Сухарукава, устаюць і накіроўваюцца да выхаду.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Я папрасіў бы вас застацца. Справа датычыць усіх.

Усе паслухмяна вяртаюцца на свае месцы.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Я прыйшоў зрабіць заяву.

**Сухарукаў** (пасля хвілёвага здзіўлення). Чым вы незадволеныя, радасць наша? Мы вас слухаем.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Вы ведаеце, што я доўга цярпеў паскудствы вашай арганізацыі. Вашыя дробныя і буйныя штучкі. Але ўсё мае межы. Я толькі вось даведаўся, што ўвесь сённяшні дзень на майго стрыечнага брата, які, дарэчы, з'яўляецца і маім поўным цёзкам, быў здзейснены ўціск з боку вашай канторы. Папершае, на працягу аднаго дня ён быў заблакаваны вашымі людзьмі ў сваёй кватэры. Па-другое, бясконцыя званкі ў дзверы і па тэлефоне, візіт нейкага вар'ята, які дамагаўся прызнаць у ім школьнага сябра... Між тым мой брат — заслужаны, паважаны ў горадзе чалавек, вядомы доктар...

**Сухарукаў.** Хвілiначку, па якім адрасе жыве ваш брат?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Першы тупік Леніна. Вы ж ведаеце....

Сухарукаў гучна рагоча, трасе галавой.

**Сухарукаў.** Ну, насмяшыў. Даўно так не смяяўся. Дзякуй, Жучок *(Разяеў падскоквае і шчоўкае абцасамі.)* Дзесяць год жыцця мне падараваў.

**Разяеў.** Жывіце вечна, Аляксандр Мікалаевіч!

**Сухарукаў.** А то ж... З вамі тут... (Разяеву). Добра, давайце вашу паперку. Пакладзем яе, як сказаў бы наш госць, пад сукно. *(Галоўнаму АПАЗІЦЫЯНЕРУ).* Між іншым, мы вас таксама шукалі. Для размовы. Ведаеце, што мы зараз з вамі зробім? Пойдзем у наш утульны падвальчык, пап'ем гарбаткі, пасумоўнічаем. Лічыце сябе нашым госцем. *(1-му афіцэру.)* Праводзьце, дарагэнькі.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Што гэта значыць? Я арыштаваны?

**Сухарукаў.** Нічога гэта не значыць. Нічога.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Але ж вы патлумачце...

**Сухарукаў.** Вы ў нас у гасцях, і ўсё на гэтым. Прайдзіце, калі ласка, з нашым супрацоўнікам. Я далучуся да вас пазней. Усе свабодныя. *(Землякову).* А вас, Аляксандр Васілевіч, я папрашу затрымацца.

Усе выходзяць. Землякоў садзіцца за вялікі стол.

**Сухарукаў.** Прысаджвайцеся бліжэй, Аляксандр Васільевіч. *(Дастае з шуфляды стала бутэльку гарэлкі, дзве шклянкі, разлівае ў шклянкі).* Гэты поспех трэба адзначыць. Такая ўдача! Такая ўдача! Я так мяркую, што наш госць нікому не распавёў пра свой візіт да нас. Па сваім вопыце ведаю: усе яны ў падобных выпадках баяцца агалоскі, баяцца кляйма здрадніка. І таму мы дапытаем яго як належыць, а пасля правядзем сеанс анігіляцыі. *(Весела.)* Быў — і няма. Шукай ветра ў полі. Катуй-ратуй. Вось давайце за гэта мы з вамі і хлабыснем.

Выпіваюць.

**Сухарукаў** *(крэкае).* Добра, курва, пайшла! Спецзаказ! Патройнайя ачыстка....

**Землякоў** *(хмялее).* Аляксандр Мікалаевіч...

**Сухарукаў.** Я...

**Землякоў.** Кажуць, вы гэта... былых Галоўных...

**Сухарукаў** *(задаволеным голасам, гулліва).* Так, праўда. Не буду вас, Аляксандр Васільевіч, падманваць. Залатыя былі дзянькі. Рука байца, як гаворыцца, «колоть устала». *(Клапатліва левай рукой расцірае правае плячо.)* Дагэтуль баліць. Працаваў я чыста, без непатрэнабга шуму. Чык — і няма лідэра апазіцыі, чык — і няма ягонага намесніка. Усё спісвалі на злачынныя разборкі, тайную эміграцыю лідэраў апазіцыі за мяжу... Падазрэнні, безумоўна, былі, але ніхто нічога не мог давесці. Можна сказаць, што сваёй працай я тады умацаваў фундамант нашай дзяржавы. Умацаваў так, што вось ужо больш як дваццаць год яна стаіць непахісна. І яшчэ столькі ж прастаіць без хваляванняў, без усялякага ліберальнага словаблудства і хістання ў галовах. А што яшчэ народу трэба? Стабільнасць і парадак — вось што галоўнае! І гэты наш госць — толькі непаразуменне, эпізод. Палез ён на гэтую горку ад кепскага ведання гісторыі. Палез, і, зразумела сарваўся, упаў і пакаціўся. І — у наш падвальчык закаціўся! *(Смяецца.)*

**Землякоў.** Але што з імі, з Галоўнымі АПАЗІЦЫЯНЕРАМІ, было далей? Целаў жа так і не знайшлі...

**Сухарукаў.** Што было далей? (Паўза). А нічога. Усе яны тут, у мяне пад замком... *(П'яным рухам паказвае на вялікую жалезную шафу за спіной.)* Нікуды не дзенуцца.

**Землякоў.** ?

**Сухарукаў.** Не верыце?

**Землякоў.** Але, Аляксандр Мікалаевіч...

**Сухарукаў** *(дастае з кішэні нізку ключоў і накіроўваецца да жалезнай шафы.)* Зараз, зараз.... Я вам пакажу.... *(Пасля некаторых высілкаў адчыняе шафу, любоўна перабірае шкілеты, якія вісяць*

*на папярэчыне.)* Вось ён, самы першы мой трафей. Дваццаць год з тае пары прайшло... *(Узвышае голас).* Але я нічога не забыў. Я ўсё памятаю! Да самых дробных дэталяў! Выйшаў ён з гасцей падшафэ. Ну мы таксоўку яму і падставілі. А за баранкай — хто б вы думалі — ваш пакорны слуга! У цёмным завулачку прытармазіў я машыну і з развароту проста ў сэрца... Ён і зразумець не паспеў анічога. Лёгкая смерць... За гэтую справу мяне і ўзнагародзілі першай Зоркай Героя. *(Вешае шкілет на месца, дастае другі).* Вось гэта ягоны, як бы, нашчадак, намеснік па партыі *(з пяшчотай разглядае шкілет).* З гэтым давялося павазіцца. Ну і нюх быў у бестыі, я вам скажу! Ніяк не маглі выманіць яго з логава, дзе ён залёг пасля знікнення шэфа. Згулялі на ягоных «высакордных пачуццях». Затрымалі ягоную жонку. Ён кінуўся вызваляць яе з палону. Ну і — апынуўся тут. *(Вяртае шкілет на месца.)* А вось гэты! Гэта ўвогуле песня! Лебядзіная песня! *(Сцэна асвятляецца прыглушаным чырвоным святлом; нягучна грае танга. Сухарукаў танчыць са шкілетам у руках і распавядае.)* Апазіцыі тады ўдалося аб'яднацца, іхны кандыдат на прэзідэнцкіх выбрах набраў больш за сорак адсоткаў. Павінен быў адбыцца другі тур выбараў, на якіх, паводле ацэнак нашых экспертаў, ён мог перамагчы. А гэта, як разумееце, крах, катастрофа. Паехаў ён у аэрапорт — збіраўся ляцець да нашых ворагаў за мяжу — ну мы яго па дарозе і перахапілі. Завалілі ахову. А яго яшчэ некалькі дзён патрымалі, пакуражыліся. Асабліва ён *(ківае галавой на партрэт на сцяне.)*

**Землякоў.** Колькі ж усяго іх у вашай калекцыі?

**Сухарукаў.** А няшмат. Сем, калі быць дакладным. Зразумела, не ўсе здабытыя мной асабіста: я ўжо займаў пасаду, якая не дазваляла выходзіць на паляванне, але яны ўсе — усе! — трапілі сюды дзякуючы мне, маім супрацоўкам! Так, вось так вось. Такія справы. *(Землякову.)* Цяпер, даражэнькі, ідзіце да нашага вязня, пагаварыце з ім, разамніцеся. А я да вас далучуся пазней. Мне трэба абцяпаць адну невялічкую справўку. Ну, ідзіце, ідзіце.

Землякоў сыходзіць. Сухарукаў, дачакаўшыся, пакуль зачыняцца дзверы, садзіцца за стол, набірае нумар на мабільным тэлефоне. Пасля паяднання промень святла выхоплівае з цемры твар чалавека, які сядзіць высока па-над сцэнай — кіраўніка спецслужбаў суседняй дзяржавы.

**Твар** *(задаволена).* Та-а-к.

**Сухарукаў.** Гэта Цэнтральны.

**Твар.** Зразумела.

**Сухарукаў.** Маю добрыя навіны.

**Твар** *(усміхаецца).* Слухаю вас.

**Сухарукаў.** Мы яго ўзялі. Заданне выканана чыста. Ускладненняў не прадбачыцца.

**Твар.** Цудоўна, цудоўна. Вас чакае бонус. Праверце заўтра ваш рахунак у Зааляндыі.

**Сухарукаў.** Дзякую.

Промень гасне, твар знікае.

**Сухарукаў** *(задаволена расцірае рукі).* Ну, цяпер да нашага вязня. Пагаворым!

Зацямненне. Кола паварочваецца.

Слаба асветлены падвальны пакойчык. Пасярод яго — вялікі, шырокі стол з прымацаванымі да яго кайданамі для рук і ног. Збоку — меншы стол з рознымі прыладамі для катавання і цcraскамі. Па абодва бакі — чорныя гатычныя крэслы. За сталом сядзяць Землякоў і Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.

**Землякоў.** Даўно хацеў з вамі паразмаўляць. Вы так рэдка нас цешыце сваёй прысутнасцю, а ў нас так шмат пытанняў.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Напрыклад.

**Землякоў.** Я з вамі ў хованкі гуляць не буду. Нас цікавяць вашыя планы, звязаныя са змяненнем існуючай дзяржаўнай сістэмы. Вы ж не будзеце адмаўляць, што такія планы ў вас ёсць. Дакладней, былі, бо мінулы час тут больш да рэчы.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Любая палітычная партыя мае сваёй мэтай прыход да ўлады, падабаецца гэта вам ці не. Так створаны свет.

**Землякоў.** Мяне не цікавіць свет. Мне цікавыя планы вашыя і вашых паплечнікаў. А свет пакінем у спакоі.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Але ж Канстытуцыя....

**Землякоў.** Канстытуцыя — толькі словы. Прычым замежнае. Паводле дэкрэту нашага правадыра вашыя дзеянні падпадаюць пад дзеянне крымінальнага кодэксу.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** А можна без гэтых таўталогіяў? Дзеянні падпадаюць пад дзеянне...

**Землякоў.** Дык мы філолагі? Тонкія эстэты? Тым горш для вас.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Пра што гэта вы?

**Землякоў.** На ўсё свой час. А пакуль — пакладзіце сваю руку вось сюды — паказвае на ціскі.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Вы думаеце, я напалохаюся? *(Кладзе руку.)*

**Землякоў.** Цудоўна *(паступова закручвае ціскі).* Вам не баліць? Не баліць? *(Пільна глядзіць у твар Галоўнага АПАЗІЦЫЯНЕРА).* Скажыце, не баліць?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР** *(праз сілу).* Так... прыемна...

**Землякоў.** Вось-вось! Мы ж вам нічога кепскага не робім....

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР** *(здаўленым голасам).* Мне гэта вядома. Вы — сумленны, прыстойны чалавек. Патрыёт сваёй радзімы.

**Землякоў.** Так, я служу радзіме, сваёй дзяржаве, якая мяне корміць, плаціць зарплату...

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** А мы — пасля, пасля змены ўлады — будзем такімі ж сумленнымі ў адносінах да вас, як і вы да нас.

**Землякоў** *(зласліва).* Вы мне пагражаеце?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Інфармую.

**Землякоў.** Я з вамі ў хованкі гуляць не буду! *(З усяе моцы заціскае ціскі; чуецца хруст костак.)* Мы будзем заўсёды! Заўсёды!

Уваходзіць Сухарукаў.

**Сухарукаў.** Спыніць! Аляксандр Васільевіч! Што гэта такое!

**Землякоў.** Прашу прабачэння ў вас і ў нашага госця. Я магу ісці?

**Сухарукаў.** Ідзіце, ідзіце! *(Землякоў выходзіць.)(Галоўнаму АПАЗІЦЫЯНЕРУ).* Як вы сябе адчуваеце? Бачу, у вас пот на ілбе... Вось што значыць самадзейнасць. Трэба Аляксандра Васільевіча публічна пакараць... Вы ўжо не крыўдуйце на яго. Навокал — ворагі. А ён стаіць на варце дзяржаўных інтарэсаў.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР** *(прыходзіць у сябе, слабым голасам, з высілкам).* Я недзе гэта ўжо чуў... Зараз вы будзеце разважаць пра ваш патрыятызм....

**Сухарукаў.** Так — мы патрыёты. Мы — аплот дзяржавы. Яе аснова. Яе Альфа і Амега! І, як любыя спецыяльныя службы, зацікаўленыя ў яе выжыванні, яе стабільнасьці.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** А мы, значыць, замінаем вам. Таму вы нас і знішчаеце.

**Сухарукаў.** Вы ж разумны чалавек. Упэўнены, вы цудоўна разумееце, што ідзе барацьба розных сістэмаў, розных сілаў... Але нешта мы не пра тое. Давайце вып'ем абяцанай гарбаткі *(падыходзіць да сцяны і націскае на кнопку; праз імгненне ў дзвярах зьяўляецца 1-ы афіцэр.)* Даражэнькі, арганізуйце нам, калі ласка, гарбаткі. *(1-ы афіцэр шчоўкае абцасамі і знікае).* Дык, уласна, пра што мы... Так, нас цікавяць вашыя, Аляксандр, планы. Альбо тое, што вы планавалі, пакуль не трапілі да нас. Зразумела?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Цалкам.

**Сухарукаў.** Ну, і што вы нам раскажаце?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Нічога *(трымаецца за пашкоджаную руку).*

**Сухарукаў.** Як гэта?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Літаральна так. Літаральна нічога.

**Сухарукаў.**Не расчароўвайце мяне, Аляксандр. Мы ж з вамі сябры, ці не? І павінныя заставаца сябрамі, — так, на ўсялякі выпадак.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Давайце ня будзем блукаць вакол. Чаго вы ад мяне хочаце?

**Сухарукаў.** Раскажыце пра вашыя планы атруціць гарадскі вадаправод...

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Гэта ўжо цікава. І як я павінен быў гэта зрабіць?

**Сухарукаў.** З дапамогай пацука.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Каго?

**Сухарукаў.** Ну што вы як маленькі. Здзіўляецеся. Бярэце добра адкормленага пацука, забіваеце, замочваеце на два тыдні ў вядры з вадой, а атрыманую ў выніку атруту выліваеце ў грамадскі вадаправод. Усё проста...

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Скажыце, а пацука трэба вымочваць менавіта два тыдні?

**Сухарукаў.** Так, інакш не будзе такога эфекту.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Так, так. Цікава, цікава.

**Сухарукаў.** Што вам цікава?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Не ведаў, што вы такі гурман. А прыправу дадаць не спрабавалі?

Паўза абурэння.

**Сухарукаў.** Значыць, жартуем? Рады, што вы ў добрым гуморы. Прычым нават пасля сустрэчы з нашым Аляксандрам Васільевічам. Але адпірацца няма сэнсу. Мы ведаем усё. *(Націскае кнопку ў сцяне; уваходзіць Разяеў з дыпламатам у руках.)* Віктар Мікалаевіч, прадстаўце нам вашу інфармацыю. *(Разяеў дастае з кішэні партатыўны магнітафон, уключае яго, з магнітафона гучыць рашучы голас Галоўнага АПАЗІЦЫЯНЕРА: «Наша мэта — стварэнне прававой дэмакратычнай дзяржавы, для гэтага...», пасля магнітафон заядае. Сухарукаў — Галоўнаму АПАЗІЦЫЯНЕРУ, радасна)* Вось бачыце, вы самі прызнаецеся ў тым, што планавалі змяніць цяперашняе дзяржаўнае ўладкаванне...

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** А цяпер ужо мы жартуем?

**Сухарукаў.** Так, значыць, працягваеце ўпірацца? Добра *(націскае кнопку ў сцяне, з-пад сцэны зьяўляецца чалавек.)* Пазнаеце? Журналіст N. Сведка. *(Журналісту.)* Распавядзіце, шаноўны, што вы ведаеце на тэму атручвання гарадскога вадаправода, якое плануецца апазіцыяй.

**Журналіст N.** У мінулым месяцы ад майго інфарматара *(шматкрот праверанага)* мне стала вядома, што наша апазіцыя, дакладней — яе правадыр — выношвае зладзейскі план атручвання пітной вады. З мэтай выклікаць народныя хваляванні, як бы «набраць ачкі», а пасля, на хвалі народнай незадаволенасці, захапіць уладу *(пасля гэтых словаў Журналіст N. знікае).*

**Сухарукаў** *(Галоўнаму АПАЗІЦЫЯНЕРУ, задаволеным тонам).* Ну, і што вы на гэта скажаце?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Ну што можна сказаць пра словы чалавека, які, безумоўна, знаходзіцца на вашым забеспячэнні.

**Сухарукаў.** Так, добра *(націскае кнопку ў сцяне; зверху на сцэну павольна спускаецца дама).* Пазанаеце?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Ірына Міхайлаўна, а што вы тут робіце?

Дама, якая спусцілася на сцэну, маўчыць.

**Сухарукаў.** Ірына Міхайлаўна, цяпер ужо няма чаго хаваць, — наш супрацоўнік. Два гады таму выконвала нашае спецзаданне ў вашых структурах. Таму пра вашыя планы нам вядома ўсё. Як цяпер? Будзем гаварыць?

Дама павольна ўзносіцца ўгару і знікае. Уваходзіць 1-ы афіцэр з падносам у руках.

**Сухарукаў.** А вось і гарбатка.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Спадзяюся, з палоніем?

**Сухарукаў.** Вы надта кепска пра нас думаеце, Аляксандр. Нашая служба такімі рэчамі не займаецца. Начыталіся дэтэктываў...

На сцэну нечакана выбягае ручны пацук.

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Ваш ласунак падышоў. Праверым на ім уздзеянне гарбаты *(ставіць кубак на падлогу; пацук даверліва падбягае, п'е гарбату і здыхае, перакуліўшыся дагары лапамі.)* Што і трэба было даказаць.

**Сухарукаў.** Супадзенне! Супадзенне!

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Як і знікненне лідэраў апазіцыі?

**Сухарукаў** (гнеўна, узбуджана). Вы што, нас абвінавачваеце ў гэтым?

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Хіба могуць быць варыянты?

**Сухарукаў** *(поўны справядлівага гневу).* Самі схаваліся па заграніцах... Піар у вас такі...

**Галоўны АПАЗІЦЫЯНЕР.** Калі так... Значыць, я магу быць свабодны? Ехаць за мяжу?

**Сухарукаў.** Ну-у-у, з вамі ў нас размова асобная. Вы ў нас пагасцюеце дзянёк-другі... Вось для вас і ложак для адпачынку гатовы *(паказвае на стол з прыладамі для катавання).* Ласкава просім прылегчы, адпачыць...

Прыбягае 1-ы афіцэр.

**1-ы афіцэр** *(хутка паўшэптам).* Аляксандр Мікалаевіч, Аляксандр Мікалаевіч!

**Сухарукаў** *(незадаволена).* Ну, што там ізноў здарылася?

**1-ы афіцэр.** Бяда!

**Сухарукаў.** Гаварыце.

**1-ы афіцэр.** Народ, абураны арыштам Галоўнага АПАЗІЦЫЯНЕРА, захоплівае ў горадзе адміністратыўныя будынкі. Армія пераходзіць на бок бунтаўшчыкоў.

**Сухарукаў.** Колькі іх?

**1-ы афіцэр.** Дакладна невядома. Але — дзесяткі, сотні тысячаў!

**Сухарукаў** *(шыпіць).* Празявалі! Тэрмінова пашліце нашыя спецыяльныя войскі! (Крычыць.) Задушыць у зародку! Знішчыць!

1-ы афіцэр выбягае. Забягае 2-і афіцэр.

**2-і афіцэр** *(спалохана).* Аляксандр Мікалаевіч, Аляксандр Мікалаевіч!

**Сухарукаў.** Ведаю, ведаю, мне ўжо данесьлі.

**2-і афіцэр.** Не, не, не тое!

**Сухарукаў** *(спалохана).* А што яшчэ?

**2-і афіцэр.** Паўстанцы штурмуюць будынак паліцыі.

Паўза. Зверху даносіцца гук натоўпу, ён нарастае. Праз сцэну нязграбна прабягае Землякоў — у жаночай сукенцы, у парыку, у белых пантофлях на высокіх абцасах, з вялікім ключом у руках. Параўняўшыся з Сухарукавым, ён падварочвае нагу і губляе пантофлю. Сухарукаў падбірае яе і здзіўлена круціць у руках.

**Сухарукаў** *(разгублена).* Аляксандр Васільевіч, вы куды? *(Землякоў не адказвае яму, сутаргавымі рухамі адчыняе таемны праход у сцяне і выходзіць, пакінуўшы дзверы адчыненымі.)*

2-і афіцэр становіцца на месца, дзе знаходзіўся журналіст N., і знікае. Праз сцэну на дзіцячым веласіпедзіку праязжае Разяеў. Задняя сцяна ператвараецца ў кінаэкран, на ёй зьяўляецца карціна народнай радасці.

**Сухарукаў** *(Галоўнаму АПАЗІЦЫЯНЕРУ.)* Брава! Бравісіма! Перайгралі вы мяне, прызнаюся. *(Убок.)* Але... удалы збег акалічнасцяў, незадаволенасць масаў... вярхі не могуць... нізы не хочуць.... *(Бадзёра, упэўнена.)* Ведаеце, як доўга я гэта хаваў: я ж таксама люблю дэмакратыю! *(Падымаецца па прыступках усьлед за Галоўным АПАЗІЦЫЯНЕРАМ.)* Я люблю дэмакратыю! Я люблю свабоду! Freedom!

Прадметы на сцэне пачынаюць рухацца: ланцугі, якія звісаюць са столі падымаюцца дагары і знікаюць за кулісамі; стол з інструментамі для катавання «ад'язжае» са сцэны ў левы бок; ціскі перакульваюцца дагары дном. Шум з вуліцы ўзмацняецца.

Заслона.

**2007 г.**

**Пераклад з расійскай Дзмітрыя СЕРАБРАКОВА**

ФРЭСКІ

# Барыс ПЯТРОВІЧ

## Фікус

Дзіўлюся, чаму ніхто на Беларусі дагэтуль нічога не напісаў пра фікус. Пра фікусы.

Некалі былі яны ці не ў кожнай паляшуцкай хаце. Як і альвас.

Ну альвас — зразумела: лекавая расліна. Палец нарваў — прыкладзі. Да раніцы ўвесь боль высмакча, скура пабялее, у гармонічак збярэцца. А ад самога альвасу — сакавітага, сопкага, толькі жорсткая скурка застанецца. Усяго сябе аддаў, каб чалавека вылечыць.

А навошта былі фікусы? Абсалютна, здавалася б, непатрэбныя расліны. Прыгажосць... Якая ад іх прыгажосць? Якое дзіва?

Гэта цяпер так думаецца. Калі мы пальмы не толькі па тэлевізары бачылі. А тады...

Зіма. Белае бяздонне. Маразы. Заходзіш у хату, а там — квітнее (іначай і не скажаш пра зялёную раскошу) фікус. І радуецца вока, і адпачывае, і не ўсё так кепска на зямлі. І не важна, што ён ніколі не цвіце... Прыйдзе вясна, абавязкова прыйдзе, і зацвітуць іншыя дрэвы і дрэўцы, кусты і кусцікі...

Вечназялёная вера ў лепшую будучыню.

Быў фікус і ў нас. Бацька зрабіў для яго з дошак чатырохкутны кадобчык. Мама палівала і выцірала мокраю анучкаю лісты. А я — прачынаўся раніцай і доўга не ўставаў — любаваўся ім. Калі я нарадзіўся, ён ужо быў. І таму я думаю, што ён быў у нас заўсёды. Прынамсі, калі я спытаў у мамы, адкуль у нас фікус, яна адказала: не ведаю — калі я нарадзілася, ён ужо рос. І расказала, што калі вёску палілі немцы, і хата нашая гарэла, бабуля ўратавала толькі абраз і фікус: вынесла ў сад. У гэта цяжка паверыць: кругом гвалт, крык, агонь, страляніна — немцы, казала мама, і па бабулі стралялі, — а яна ратуе фікус. Быў пачатак лета, і ён у садзе не прапаў, а на восень забралі яго ў зямлянку, і быў ён высокі — да столі, і ўсю зіму грэў іх зялёнаю надзеяй на вясну.

Фікус шмат пабачыў у сваім жыцці, ён — жывы сведка і летапісец гісторыі нашай сям'і. Але ён ніколі нікому нічога не раскажа: ні сваім, ні ворагам. З ім, як з жывым, можна гаварыць пра ўсё, дзяліцца сваімі крыўдамі і шчасцем. Ён зразумее, ён паспагадае ўжо сваёю маўклівай прысутнасцю.

Дзіўна, але я ніколі не бачыў, каб нехта на яго злаваў, каб нехта замахнуўся на яго, зламаў наўмысна ці хоць адарваў бліскучы, бы лакаваны, ліст.

Да фікуса прывыкалі, ён не заўважаўся, нікому не замінаў, не перашкаджаў. Але варта было яго прыбраць, як у сэрцы пасялялася незразумелая туга: чагосьці не хапала ў хаце — сябра не хапала, маўклівага, цярплівага сябра.

Апалыя бліскучыя лісты ягоныя былі мне першымі цацкамі. Але я ніколі не зрываў іх, чакаў, калі ўпадуць самі...

Але вось знік ён з вясковых хатаў, і ніхто не заўважыў таго.

Няўдзячныя людзі. Яны замянілі фікусы на тэлевізары. На тых месцах, дзе стаялі фікусы, цяпер стаць тэлевізары.



Той, хто скажа, што гэта раўнацэнная замена, хай першы кіне ў мяне камень...

## Карчма пры дарозе

*Сяргею Дубаўцу замест абяцаных уюноў.*

Блукаючы па Беларусі ў часе, я аднойчы забрыў у карчму каля невялікага мястэчка на цяперашняй Гарадзеншчыне. Па маіх падліках, я трапіў у 1790 год ці недзе блізка да яго. У карчме было душна, сыта пахла смажанінай і стаяў ціхі гоман — бы шапаценне лесу пад ветрыкам. Хоць быў сонечны дзень, невялікія акенцы слаба асвятлялі залу, і ўвайшоўшы са святла ў прыцемкі, я амаль нічога і нікога не ўбачыў з наведнікаў, а толькі карчмара за прыстолкам, бо з правай рукі ягонай стаяла свечка, і святло яе, шугануўшы ад скразняку адчыненых дзвярэй, зрабіла ягоны твар роўна-жоўтым, воскавым, як у нежывога. Карчмар не варухнуўся, не зірнуў на мяне, не прывітаў, як прынята, і я падумаў, што нешта парушыў у правілах перамяшчэння, а таму патрапіў у нерухомы свет. Такое бывала не аднойчы, але... Але вецер, пахі, гоман... пераканалі мяне, што жыццё тут не спынілася, што я памыляюся ў першых сваіх меркаваннях. Я сеў за бліжэйшы ад уваходу драўляны стол і, шаркнуўшы рукою па шурпатай стольніцы, адразу ж адчуў, што загнаў у даланю скабку з негабляванае дошкі.

Карчмар ажыў, выйшаў з-за свайго прыстолку, выціраючы рукі аб брудны хвартух, павольна падышоў да мяне:

— Пан не памыліўся, выбраўшы маю карчму, — рыпучым голасам прастуджанага чалавека сказаў ён, — лепшых клёцак і мядовае бражкі вы не знойдзеце нідзе. А калі пажадаеце — паўгадзіны, і найлепшая свіная галёнка будзе гатовая для вас.

Я папрасіў куфаль піва і метку сушаных уюноў, якіх у нашым стагоддзі ўжо не знойдзеш, а я палюбіў іх смакаваць, вандруючы ў мінулым. Шчыра скажу — нічога смачнейшага да піва я не еў. О, сушаныя ўюны! З выгляду непрыбаўныя чорна-брунатныя скручаныя карэньчыкі. А смак! Бярэш за галаву і адкусваеш з хваста, запіваеш півам. Семкі, арэшкі — еў бы і еў без канца...

— А бражку? — перапытаў карчмар.

Ад бражкі я адмовіўся рашуча. Як п'юць гэтае саладжавае смярдзючае пойла, хай і з прысмакам мёду, людзі — я не ведаю. Мажліва, за стагоддзі нашыя густы памяняліся, бо большасць у карчме пілі якраз бражку, пры гэтым ніколькі не заўважалі яе брыдкага, гнілога паху, які перасядае ў горле, і нічым яго не прапаласкаць. А калі адрыгнецца, а бражка любіць адрыгацца... Бр-р-р!..

Ранейшыя людзі не ўмелі хаваць сваіх эмоцыяў, і я ўбачыў, што маё з'яўленне не проста ўзрушыла карчмара, а нават спалохала. Ведаць, а тым болей пазнаць мяне ён не мог. Значыць, прыняў за кагосьці са знаёмых — далёкіх знаёмых. Рэдка бачаных, а можа і не бачаных, а проста чутых: маўляў, ёсць такі пан, пра якога кажуць, што... Што кажуць, я не паспеў дадумаць, бо карчмар прынёс піва і ўюноў.

— Можа, пан застанецца начаваць? Дык у нас і забава яму знойдзецца... — ці то спытаў, ці то прапанаваў карчмар. Слова «забава» ён сказаў працяжна: «за-ба-ва», пры гэтым падміргнуў, каб я зразумеў, што размова ідзе пра жанчыну.

Планаў пэўных у мяне не было. Я не ведаў, яшчэ застануся тут ці да вечару вярнуся дамоў. Шчыра сказаць, вяртацца не хацелася, але і заставацца тут на ноч... таксама жадання не было. Я ўяўляў, што можа прапанаваць гэты карчмар — ложак з бруднай пасцілкай і саламяным матрацам, поўным блых ды клапоў... а «забаваю» будзе, хутчэй за ўсё, ягоная тоўстая ды потная... жонка. Я прыблізна ведаў гэта. Аднак яшчэ не прыняў рашэнне, заставацца ці сыходзіць, няўцямна хітнуў галавою, і рух той, пры жаданні, можна было палічыць і як згоду, і як адмову.

Карчмар у відочным задуменні адышоў. Ён не зразумеў «так» ці «не» азначае тое маё хітанне галавою, але перапытаць не адважыўся.

Я грыз уюны і запіваў півам, калі аднекуль з бакавухі, з дзвярэй, завешаных нават з выгляду цяжкай, насычанай вільгаццю і пахамі карчмы анучай-параванам, да прыстолка выйшла дзяўчына. Твар яе нібы заспаны, нечым незадаволены, але ад таго яшчэ больш прыгожы і прывабны, што бывае толькі ў вельмі маладых жанчынак. Валасы заплеценыя ў тугую касу, якая ляжала між грудзей, і кончык яе дзяўчына церабіла, быццам даплятала і тым яшчэ больш акрэслівала сваю... трывогу. Карчмар глянуў на мяне і, убачыўшы, што я назіраю за дзяўчынай і не магу адарваць ад яе позірк, задаволена пасміхнуўся ў рэдзенькія, але доўгія вусы. «Не, гэта не жонка, — падумаў я, — і мусіць, не дачка...»

Прызнаюся адразу: жанчыны ў маіх вандроўках цікавілі мяне менш за ўсё. Адкрыўшы мажлівасць вяртацца ў мінулае, я зрабіў гэтую справу для сябе і турызмам, і... бізнэсам. У сваім часе грошы я зарабляў продажам антыкварыяту і старых рэдкіх манетаў ды купюраў для нумізматаў. Рабіць гэта было проста. Трэ было прыхаваць рэчы і манеты ў прыкметнай мясціне, якая не можа змяніцца і праз гады, а потым вярнуцца «выкапаць клад», закапаны табою самім. Першы раз, з першага ж падарожжа — я набраў манетаў і рэчаў поўныя кішэні, і назаўтра па вяртанні паказаў іх спецыялістам. «Падробка», — сказалі яны, — гэтым манетам не больш за 2-3 гады, а дата на іх стаіць з васемнаццатага стагоддзя... Глянце, яны ж блішчаць, як учора зробленыя...» І сапраўды, як манеты маглі састарыцца, калі я зарабіў іх пазаўчора, прадаўшы аднаму цікаўнаму панычу бутэлечку пахкага «французскага адэкалону», купленага ў сябе ў маркеце за капейкі. І тады я здагадаўся: не варта прыносіць рэчы адтуль наўпрост, з сабою, трэба схаваць іх там і «знайсці» тут, каб яны паспелі «састарыцца».

А ўвогуле — гэта быў толькі мой заробак, бо цікавасць мая ў мінулым палягала ў іншым: як гісторык — я хацеў папрысутнічаць пры «знакавых» падзеях, стаць непасрэдным сведкам іх, каб расшыфраваць некаторыя «белыя плямы» нашае мінуўшчыны, прасачыць лёс пэўных асобаў і «разгадаць» (папросту ўбачыць) тыя таямніцы іх жыцця, што не даюць спакою даследчыкам, якія напісалі дзесяткі кнігаў і сотні артыкулаў, кожны са сваёю версіяй, але праўды ніхто так і не ведае. Што я маю на ўвазе: як, за што і з кім выдаваў свае першыя кнігі Скарына, ці быў ён у Маскве, як і дзе памёр і інш. Як загінуў Янка Купала. Цікавіў мяне лёс, да прыкладу, Еўфрасінні Полацкай ды Кірылы Тураўскага (гэта ён сапраўды напісаў «Слова пра паход Ігаравы», ці то падробка Мусіна-Пушкіна, зробленая ў васемнаццатым стагоддзі); ды ці мала цікавостак хавае нашае мінулае?.. Яшчэ цікавіў мяне лёс некаторых рэчаў, што пакінулі след у нашай гісторыі, але зніклі невядома дзе і як — так, так, я пра Крыж Еўфрасінні Полацкай і не толькі пра яго... Але.

Але ў мінулым няма прамых шляхоў. Там сотні зблытаных сцежак, пайшоўшы па адной з якіх, можаш выйсці зусім не там, дзе хацеў, а там, куды яна цябе выведзе. Таму я кажу: блукаю ў стагоддзях, а не падарожнічаю. Я пачаў быў складаць своеасаблівую мапу: адкуль куды можна выйсці, але яшчэ больш заблытаўся і вырашыў пакуль не выпрабоўваць свай лёс, а аддацца ягонай волі. Не раз за час блуканняў трапляў я ў безвыходныя, здавалася б, сітуацыі, не раз быў на валаску ад смерці, але пакуль што кожны раз мне ўдавалася вырвацца жывым. Хоць, калі ў апошнім сваім паходзе ў мінулае я патрапіў у асаджаны маскалямі Віцебск (потым, па захопе, жыхары гораду былі выразаныя ўсе да аднаго — і дзеці, і жанчыны...), то падумаў, ведаючы гісторыю, што тут мне і канец... Але ў апошнюю ноч перад штурмам я ўсё-ткі пакінуў горад па адной з часавых сцежак, праўда, выйшаў не да сябе, а ў Гедымінаву Вільню, але адтуль ужо шлях дамоў быў мне вядомым і простым.

Аднак — я зайшоў у карчму, каб спатоліць смагу, выпіць найсмачнейшага беларускага піва і пасмакаваць сушаных уюноў. Дарэчы, зацікавіўшыся гэтай незвычайнай рыбкай, якой ужо амаль няма ў нашых балотах і рэчках, а калі і ёсць, дык ніхто цяпер і не дадумаецца яе сушыць у печы, я перачытаў трохі літаратуры пра яе, акрэсліў мажлівы арэал засялення і адным сухім летам знайшоў-ткі ў нас на Палессі гэтую... хацеў сказаць рыбу, але згадаў, што не лавіў я яе, а ў вадзе здабываў, а ў высахлай канаве. На дне яе ў прасохлым глеі віднеліся дзірачкі. Значыць, паводле кнігаў, — уюны тут. І я пачаў раскопваць глей рукамі ў загадзя падрыхтаваных гумавых пальчатках. І дакапаўся — ужо ў першай ямінцы на дне крутнулася жоўта-карычневае змяінае цела і пачуўся апісаны ў літаратуры піск, які ўюны робяць не ротам, як падумаецца, а... анальнай адтулінай. Я спалохаўся, адкінуўся ад ямінкі, а потым спахапіўся і пачаў капаць далей, там, дзе схаваўся ўюн. І праз хвілю ён ужо з'явіўся на паверхні. Злавіць яго ў слізкіх пальчатках было немагчыма. Я адкінуў іх і пачаў хапаць уюна голымі рукамі, сяк-так злаўчыўся і ўкінуў у торбачку. Неўзабаве адкапаў я другую рыбінку, яшчэ большую, таўшчынёю з вялікі палец і даўжынёю сантыметраў дваццаць, потым трэцюю... Кажу «рыбінку», а сам думаю — вужака нейкая то была, а не рыбінка...

Але — я ў карчме і каля гаспадара стаіць файная дзяўчына, відочна, не дачка, і тым болей — не жонка гаспадара. Прыслуга? Парабчанка? Не, пэўна, не... не можа быць, дый не хочацца мне чамусьці ў гэтай дзяўчыне бачыць самадайку, пра што і намякаў мне карчмар... Дужа не падобная яна на прастытутку: бо, відочна, не стомленая каханнем, а шукае яго. Я бачыў, як зыркнула яна ў залу, як ацаніла кароткім позіркам, хто ў ёй ёсць, і я запыніла свой позірк на мне. Няўлоўна, на хвільку, але запыніла.

Не было ў мяне планаў заставацца тут на ноч. Не таму, што я спяшаўся некуды ці спазняўся. Я проста хацеў вярнуцца дамоў сёння, хоць вырашыў гэта толькі цяпер, ды... і то не пэўна, а так... хай будзе, як будзе... Я яшчэ раз глянуў на дзяўчыну — адкрыта, але без выкліку, і яна адразу перахапіла і вытрымала мой позірк. Кантакт быў, а таму мне раптам канчаткова расхацелася заставацца тут: не люблю я лёгкае здабычы, хоць і не заўзяты паляўнічы... Я махнуў рукой карчмару, той адразу ж падбег. «Хачу разлічыцца, кажы, колькі». Карчмар падняў галаву ўверх, закаціў угору вочы, і пачаў нешта падлічваць, мармычучы. Падлік даваўся яму цяжка. Не таму, што лічыць хутка не ўмеў, а таму, што, мусіць, імкліва прыкідваў: колькі з такога пана можна ўзяць?

Абурэнне палітычных праціўнікаў Цімашэнка лёгка зразумець: прыём з выплатай тысячы грывен выклікаў новы ўздым яе папулярнасці. На базарах, у маршрутках і чэргах толькі і кажуць пра тое, што Юлія — маладзец, а Януковіч замінае ёй працаваць.

Гэта не значыць, што ўкраінцы так проста сталі ахвярамі, па вялікаму рахунку, піяр-прыёму Юліі. Усе цудоўна разумеюць, што тысяча грывен, натуральна, далёка не поўная кампенсацыя іх старых укладаў. Аднак у іншых рэспубліках былога СССР і гэтага няма. Толькі Літва поўнасцю разлічылася са сваімі грамадзянамі, праўда, на гэта пайшло 80 працэнтаў прыбыткаў, атрыманых краінай ад прыватызацыі. У сярэднім былы літоўскі ўкладчык Ашчадбанку атрымаў 960 долараў ЗША. Эстонія дасюль кампенсуе сваю запазычанасць. Малдова плануе разлічыцца на працягу 20 гадоў. Казахстан правёў кампенсацыю праз эмісію дзяржаўных каштоўных папераў, у якіх за 150 савецкіх рублёў можна атрымаць адзін долар. Азербайджан гатовы выплаціць даўгі па курсу адзін долар за адзін савецкі рубель, аднак толькі тым укладчыкам, якія трымалі ў Ашчадбанку не больш за 2000 рублёў. Адзначым, што гэта пакуль толькі праект. Кіргізія так і не пачала кампенсацыю праз брак фінансаў, хаця закон пра кампенсацыі існуе. Ну а ў Расіі нават не прыняты адпаведны закон. За сітуацыяй на 2007 год расійская дзяржава вінаватая сваім грамадзянам 10,9 трыльёна рублёў. Нарэшце, пра Беларусь. Напрыканцы 90-х Лукашэнка захацеў выплаціць запазычанасць з разліку адзін долар за савецкіх 450 рублёў. Аднак дурняў знайшлося няшмат, і рэформа ляснулася. Зараз, быццам, рыхтуецца новы закон.

ЦІКАВА

# НАЦЫСЦКІ ДАВОС: ГІСТОРЫЯ АДНАГО ГОРАДУ

Алег ПЯТРОЎ




**У швейцарскім Давосе пачынае працу чарговы сусветны эканамічны форум. Мала хто ведае, што Давос у 30-я гады XX стагоддзя гадоў быў вядомы як альпійская сталіца нацызму.**

37 гадоў таму нямецкі эканаміст Клаўс Шварб прапанаваў Давос як штогадовае месца сустрэчы сусветнай капіталістычнай эліты. Як вынік — кожны год невялікі горад з насельніцтвам 10 000 чалавек ператвараецца ў неафіцыйную сталіцу планеты. На пачатку кожнага года на гэтым альпійскім курорце ў межах сусветнага эканамічнага форуму сустракаюцца самыя ўплывовыя ў свеце асобы, каб абмеркаваць сцэнар развіцця чалавецтва. Сярод удзельнікаў саміту ў свой час былі такія вядомыя персоны, як Біл Клінтан, Ясір Арафат, Колін Паўэл, Тоні Блэр, Шымон Пэрэс.

Аднак да Шварба былі іншыя немцы, якія таксама рабілі гісторыю Давоса. Мова перш за ўсё пра Аляксандра Шпэнглера, удзельніка нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Германіі 1848 года. Пасля таго, як манархічная рэакцыя задушыла еўрапейскую «Вясну народаў», у тым ліку ў Германіі, Шпэнглер збег у Швейцарыю. Разам з адным галандскім доктарам спадар Шпэнглер заснаваў у Давосе бальніцу, якая спецыялізавалася на хворых на сухоты.

Хутка шпэнглераўскі курорт стаў вядомым ва ўсёй Германіі, і немцы, якія прыехалі сюды, заснавалі ў Давосе сапраўдную калонію. Напярэдадні першай сусветнай іх было тут ужо 11 000 чалавек. Дарэчы, сярод наведвальнікаў Давосу быў у свой час і славуты Томас Ман, які якраз тут пачаў пісаць свой вядомы раман «Зачараваная гара». Тут таксама адпачывалі вучоны Альберт Энштэйн і пісьменнік Эрых Марыя Рэмарк.

Да вядомых імёнаў, якія зрабілі славу Давосу, адносіцца і прозвішча Вільгельма Гуслафа, лідэра швейцарскіх нацыстаў. Якраз у Давосе ён памёр пасля таго, як у лютым 1936 года Давід Франкфутэр, 28-гадовы медык габрэйскага паходжання, разрадзіў у яго пісталет. Забойца быў адразу арыштаваны паліцэйскімі, аднак паспеў сказаць журналістам, што «гэтыя кулі мелі патрапіць у Гітлера». Давід Франкфутэр шляхам забойства Гуслафа меў намер адпомсціць за пераслед габрэяў у Германіі.

Швейцарскі «Гаўрыла Прынцып» быў прызнаны судом вінаватым і асуджаны на 18 гадоў турмы. У 1945-м Давід атрымаў амністыю і пераехаў у Ізраіль, дзе памёр у 1982 годзе.

Аднак вернемся ў Давос 30-х гадоў. Як толькі ў III Рэйху стала вядома пра ўчынак Франкфутэра, Гуслаф стаў героем-пакутнікам нацыстаў. Гітлер асабіста прыняў удзел у пахаванні Гуслафа на ягонай радзіме ў Шверыне. Дарэчы, потым цела нябожчыка знаходзілася разам з 14 целамі іншых герояў нацызму на борце нямецкай падлодкі, якая напрыканцы другой сусветнай выйшла ў Паўночнае мора. Ніхто дасюль не ведае, куды мела плыць субмарына, якую тады затапілі савецкія тарпеды.

Аднак вернемся да асобы Гуслафа, які за па пяць гадоў да смерці атрымаў ад фюрэра паўнамоцтвы на стварэнне ў Швейцарыі руху нацыстаў.

Сталіцай швейцарскіх прыхільнікаў НСДАП стаў Давос. На дзесяць тысяч жыхароў гораду ў час папулярнасці Гуслафа было паўтары тысячы сябраў партыі Гітлера. Рух існаваў перш за ўсё дзякуючы санаторыям, якія фінансаваліся нямецкімі нацыяналістычнымі арганізацыямі. Імідж Давосу як цэнтру швейцарскага нацызму спрыяў таму, што выключна тут з часам пачалі адпачываць бонзы і апаратчыкі нацысцкага рэжыму. У выніку ўжо ў сярэдзіне 30-х Гуслаф паспяхова правёў кампанію байкоту крамаў гандляроў, якія адмаўляліся прадаваць тавары, што былі выраблены выключна ў Германіі.

> Дарэчы, сярод наведвальнікаў Давосу быў у свой час і славуты Томас Ман, які якраз тут пачаў пісаць свой вядомы раман «Зачараваная гара»

Гэта акцыя прынесла яму славу «Фюрэра Альпаў». На гэты час ужо 5 000 швейцарцаў былі сябрамі нацысцкіх клубаў, якімі кіраваў Гуслаф. Паколькі яго рэзідэнцыя была ў Давосе, горад атрымаў мянушку «крыніца нацызму». Часам даходзіла да таго, што на вуліцах гораду людзі пачыналі вітаць адзін аднаго салютам «Хайль Гітлер». На самай справе, шмат хто з мясцовых не любіў нацыстаў, аднак пасля сусветнага эканамічнага крызісу 1929 года якраз турысты з Германіі, дзе набываў сілу нацызм, станавіліся сродкам выжывання гораду. Роля Германіі як важнага сродку для падтрымання мясцовай гаспадаркі стала важнейшай падчас другой сусветнай вайны, калі Давос стаў цэнтрам рэабілітацыі параненых салдатаў войска Вермахту.

Але ў гэты час дзейнічаць нацыстам было не так проста, як раней. Учынак Франкфутэра, як не дзіўна, меў уплыў на швейцарскіх заканатворцаў. У 1936 годзе цэнтральны ўрад забараніў дзейнасць нацысцкіх асацыяцый на тэрыторыі швейцарскай канфедэрацыі.

Цікава, што, каб абыйсці закон, амбасада Германіі, якая не галосна падтрымлівала мясцовыя нацысцкія ініцыятывы, выкарыстоўвала імя славутага лучніка Вільгельма Тэля. Таго самага легендарнага Вільгельма Тэля, які трапіў у яблык з арбалету на галаве свайго сына.

Пры падтрымцы нямецкага пасла Георга Бомэ ў Швейцарыі рэгулярна праводзіліся турніры лучнікаў, якія на самай справе былі сродкам камунікацыі мясцовых праварадыкалаў. Аднак больш за 10 працэнтаў на выбарах у Швейцарыі падчас вайны сімпатызанты Гітлера сабраць не змаглі. У 1943-м іх увогуле забаранілі. Некаторых са швейцарскіх нацыстаў нават пакаралі смерцю.

Як бы тое ні было, яшчэ ў лютым 1945 года ў консульстве Германіі ў Давосе пад ціскам мясцовай нямецкай камуны святкавалі гадавіну прыходу Гітлера да ўлады. Давосцкія аматары фашызму нават не дапусцілі, каб 8 мая 1945 года — дзень капітуляцыі Вермахту — была знішчана свастыка, якая знаходзіўся на ўваходзе ў будынак. Гэта была агонія: амаль на наступны дзень швейцарскія ўлады забаранілі ўсе нямецкія прафашысцкія арганізацыі ў Давосе. Была нават арганізаваная масавая здача партыйных пасведчанняў НСДАП.

Нарэшце, на пачатку 1946-га імідж Давосу канчаткова перастаў выклікаць асацыяцыі з нацызмам. З ініцыятывы жыхароў камуны тут быў арганізаваны курорт для габрэйскіх дзяцей — ахвяр нацысцкіх канцлагераў. А ў 1970-м Давос стаў горадам, якім мы ведаем яго сёння, — месцам правядзення сусветнага эканамічнага форуму.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР БАРЭЙЧУК



Намеснік старшыні партыі Кангрэс украінскіх нацыяналістаў (КУН), якая ўваходзіць у склад блока Наша Украіна — Народная Самаабарона (НУНС) (палітычная сіла, якая падтрымлівае прэзідэнта Юшчанку) патрабаваў ад мэра сталіцы дэмантаваць лядовы каток каля храма Святой Сафіі ў Кіеве. Каток быў заліты яшчэ падчас школьных зімовых канікул. На думку правадыра нацыяналістаў, аб'екты такога кшталту, як каток каля Сафіі, — замах на статус святога месца і перашкода для святкавання дня Сабарнасці Украіны, які адзначаюць 22 студзеня. Нагадаем, што Дзень сабарнасці звязаны з 22 студзеня 1919 года, калі Заходняя Украінская Народная Рэспубліка ўвайшла ў склад Украінскай Народнай Рэспублікі). Акт пра аб'яднанне дзвюх украінскіх дзяржаўных фармацый быў урачыста падпісаны якраз на Сафійскай плошчы ў Кіеве, на тым самым месцы, дзе зараз каток. Традыцыйна 22 студзеня правыя ўкраінскія партыі выходзілі на Сафійскую плошчу, аднак у гэтым годзе традыцыя будзе сарваная.

Самая смешнае, што на абарону катка ўсталі царкоўнікі. Кіраўнік прэс-службы Украінскай праваслаўнай царквы, заявіў, што «каток — гэта, наадварот добра». «Тут жа могуць адпачыць дзеці», — кажа ён, спасылаючыся на досвед Масквы, дзе заліваюць пад каток частку Чырвонай плошчы. Але КУН не збіраецца так проста здавацца. У панядзелак 21 студзеня з гэтай нагоды адбыўся пікет мэрыі, а ў аўторак 22 студзеня падчас урачыстасцей на плошчы, нацыяналісты спрабавалі дэмантаваць каток сваімі сіламі, аднак былі вымушаны адступіць праз колькасную перавагу прадстаўнікоў службы правапарадку.

### РЭДЖЭП ЭРДАГАН



Прэм'ер-міністр Турцыі і лідэр ісламскай партыі нават пасля перамогі на парламенцкіх выбарах улетку працягвае барацьбу з рэспубліканскімі апанентамі, якія бачаць у дзейнасці яго партыі пагрозу свецкім прынцыпам турэцкай дзяржавы. Рэспубліканская апазіцыя вельмі жорстка адрэагавала на словы прэм'ера, якія былі сказаныя ім падчас візіту ў Іспанію. Эрдаган заявіў, што не трэба больш разглядаць ісламскія жаночыя хусткі як палітычны сімвал. Хусткі, дарэчы, былі забароненыя яшчэ самім заснавальнікам турэцкай рэспублікі Атацюркам, які бачыў Турцыю часткай еўрапейскай цывілізацыі. Эрдаган лічыць, што закон пра забарону хустак, прыняты амаль 80 гадоў таму, састарэў. «Сёння ў свеце, дзе людзі думаюць вольна, кожны мае права насіць любое адзенне», — заявіў кіраўнік ураду. Паралельна ў некаторых універсітэтах вырашылі дазволіць насіць хусткі. Гэта, а таксама рэмарка лідэра ўраду, сталі падставай для шэрагу крытычных атак з боку апазіцыі і прадстаўнікоў галін улады, якія кантралююць нацыяналісты (так у Турцыі называюць кемалістаў). Турэцкі Вярхоўны суд прыняў спецыяльную заяву супраць паслаблення забароны мусульманскіх хустак на тэрыторыях універсітэтаў, паколькі «такая практыка можа парушыць грамадскую згоду». Адразу за суддзямі сваё слова сказаў галоўны пракурор, на думку якога, «палітычныя партыі не маюць права рабіць якія-небудзь крокі супраць свецкіх прынцыпаў рэспублікі». Як лічаць эксперты, Эрдаган у такой сітуацыі будзе намагацца ўнесці пункт пра праве жанчын насіць ісламскі касцюм у тэкст новага праекту канстытуцыі. Праўда, для прыняцця новага Асноўнага закону спатрэбяцца як мінімум некалькі месяцаў.

### РАМАНО ПРОДЗІ



Кіраўнік левацэнтрыскага кабінету Італіі фактычна прызнаў, што прайграў вайну супраць мафіёзнага клана Камора, які кантралюе правінцыю Катанія (сталіца Неапаль). Дасюль нават з дапамогай войска ўлады не могуць наладзіць вываз смецця з некаторых кварталаў сталіцы і правінцыі з-за таго, што мафія штучна выклікае коркі на вуліцах. Другі правал Продзі — адстаўка Клемента Масэла, міністра юстыцыі. Масэла падазраюць у тым, што ён прызначаў на ўрадавыя пасады ў тым жа Неапалі сваіх людзей. Ёсць думка, што прозвішчы кандыдатаў узгадняліся з тымі ж босамі Каморы. У выніку кабінет Продзі аказаўся на парозе палітычнага крызісу. Кааліцыя, якая падтрымлівае яго ў парламенце, вельмі стракатая: дзевяць партый з такімі ненадзейнымі партнёрамі, як Партыя каталікоў, камуністы і «зялёныя». На пачатку года Продзі ледзь не атрымаў вотум недаверу з-за нежадання камуністаў галасаваць за працяг знаходжання італьянцаў у Афганістане. На гэты раз, калі пацвердзіцца версія, што Масэла дзейнічаў не адзін, а меў сяброў па карупцыйных схемах ва ўрадзе, справа можа закончыцца крахам кааліцыі. Чакаюць, што Продзі хутка агалосіць правядзенне рэферэндуму па рэформе выбарчай сістэмы і перагляду формулы заробкаў чыноўнікаў, каб рэабілітаваць сябе ў вачах электарату. На кану справа яго жыцця — стварэнне «другой італьянская рэспублікі».

▸ ВЫСТАВА

# ПРА ВЕЧНАЕ, ПРА ГАРМОНІЮ СУСВЕТУ…

Іна БЕРАЗІНСКАЯ

**Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры Валерый Шкаруба прадставіў на сваёй персанальнай выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі больш за 50 жывапісных работ. Стрыманыя па каляровай гаме тутэйшыя пейзажы прымушаюць задумацца пра вечнае, пра гармонію сусвету, адчуць значнасць усяго жывога ў прыродзе.**





Валерый Шкаруба нарадзіўся і вырас у беларускай глыбінцы, у простай працавітай сям'і. З дзяцінства быў прывучаны да цяжкай сялянскай працы. Але Божы покліч, відаць, вельмі рана падказаў яму, чым варта займацца па жыцці. Таму што ўжо ў шэсць гадоў хлопчык запатрабаваў у бацькоў паперу і алоўкі. Тыя былі нямала здзіўленыя, таму што ў іх родзе ніхто такім «*баловством*» не займаўся, усе моцна былі звязаныя з зямлёй. Дзед Валерыя, да прыкладу, быў магутны мужык, славіўся небывалай сілай — каня мог падняць.

Адоранаму ад прыроды юнаку з правінцыі было няпроста атрымаць прафесійную адукацыю, асвоіцца ў сталічным мастакоўскім асяроддзі, набыць упэўненасць у сваіх сілах, а пазней і пэўную незалежнасць, неабходную для таго, каб сканцэнтравана займацца мастацтвам. Мець статус «вольнага мастака», як вядома, можа дазволіць сабе толькі запатрабаваны аўтар, чые творы ахвотна купляюцца.

Усё яшчэ памятаецца адчуванне здзіўлення і светлай радасці ад першых карцін пачынаючага жывапісца, якія пабачыла на выставах у Мінску. Тады (а было гэта больш за два дзесяткі гадоў таму) Валерый жыў у раёне Зялёнага Лугу, і на натуру хадзіў або ў Севастопальскі парк, або ў яблыневы сад, што знаходзіўся непадалёку ад цяперашняй Нацыянальнай бібліятэкі. На яго палотнах не прысутнічала ніякіх экзатычных «прыгажосцяў», выкручастых сюжэтаў. Усяго толькі буйна квітнеючая яблынька пад агромністым купалам бяздонных нябёсаў, сцяжынка, што бяжыць за далягляд і запрашае за сабой у невядомасць, размытая восеньскімі нуднымі дажджамі сельская дарога з агромністай лужынай, у якой адлюстроўваюцца злавесна-свінцовыя аблокі. Але за гэтым хавалася штосьці, што прымушала думаць пра жыццё-быццё тутэйшага люду, здавён аселага на гэтых землях, разважаць пра тое, як уладкаваны наш свет і што такое ёсць чалавек у бясконцым Космасе. Акрамя таго, калі разглядаеш някідкія «беларускія карцінкі», нібы адчуваеш халадок, што ідзе з азёрных глыбінь, ласкавае цяпло напоенай сонцам зямлі, чуеш шаргатанне мінулагодняй, колеру іржы травы ў зімовым садзе, цішыню, якая аж звінела на адзінокім хутары.

У 1986 годзе ў Беларусі здарылася бяда. Чарнобыль. Пра маштабы аварыі і яе наступствы можна было толькі здагадвацца. У газетах пра тое праўды не пісалі. І вось тады ў зону, адкуль адсялілі мясцовых жыхароў, адпраўляецца група беларускіх мастакоў, куды ўвайшоў і Валерый Шкаруба. Кожны з удзельнікаў той экстрэмальнай экспедыцыі пішa свае сюжэты: нехта занатаваў «ліквідатараў», апранутых у касцюмы для хімічнай абароны, якія нагадвалі касмічных прышэльцаў, што руйнуюць з зямлёй вялікую вёску, нехта — вымушаных эвакуявацца з родных мясцін вяскоўцаў, іншыя звярнулі ўвагу на разбураную канструкцыю станцыі. Валерый Шкаруба застаўся верны сабе — сканцэнтраваўся на пейзажы, уважліва адбіраў дэталі для таго ці іншага сюжэту, фармуючы іх на палатне так, каб самі выяўленчыя сродкі, якімі карыстаецца, выклікалі пэўныя пачуцці, сугучныя таму, што адбылося, — трывогу, занепакоенасць, насцярожанасць. Яго пейзажы па свайму эмацыянальнаму напалу сталі ледзь ці не самымі моцнымі мастацкімі творамі, паказанымі на рэспубліканскай выставе «Чарнобыля чорны боль». І ў далейшым Валерый Шкаруба напіша яшчэ не адну работу, імпульсам да стварэння якой паслужыла яго паездка ў чарнобыльскую зону, і гэтыя пейзажы будуць з вялікім поспехам дэманстравацца на выставах як на радзіме, так і ў далёкім замежжы.

Дастаткова маладым Валерый Шкаруба стаў вядомым мастаком. Адыграла, відаць, сваю ролю і цікавасць да яго работ на Захадзе. У 90-х гадах там становіцца модным канцэптуальнае мастацтва. А беларускі мастак і быў адным з першых айчынных канцэптуалістаў, што падпарадкоўваў усё ў сваім творы пэўнай ідэі.

— Сапраўды, я амаль ніколі не пісаў свае пейзажы з натуры, як гэта робяць многія іншыя. Хаця і раблю іншым разам замалёўкі, эцюды, — расказвае Валерый Фёдаравіч, — але я звычайна «канструюю» свой твор у майстэрні, і тая канструктарская праца бывае іншым разам вельмі працяглай — ад некалькіх месяцаў да года. Так што задума, ідэя заўсёды першасная. Надзвычай цікавы сам працэс працы. Чалавечая, мастакоўская інтуіцыя падказваюць мне, што менавіта павінна быць на той ці іншай карціне, якую я задумаў, бо прырода знаходзіцца ў вечнай зменлівасці, і кожны яе стан непаўторны і своеасаблівы. Асабіста мне падабаецца няўлоўная гульня святла і цемры, пераходных станаў у прыродзе.

На выставе Валерый Шкаруба паказвае ўсё лепшае, што было створана ім за больш чым два дзесяцігоддзі ўпартай працы. Як і многія яго таленавітыя папярэднікі, такія, як, напрыклад, Вітольд Каэтанавіч Бялыніцкі-Біруля, Шкаруба стварае пейзажы, у якіх прысутнічае сапраўдная, а не прыдуманая Беларусь, і менавіта тая прырода, якая шмат у чым сфармавала характар народа, што жыве тут спрадвеку. Таму і цягнуцца душой да гэтых твораў гледачы, марацьі спадзяюцца калі-небудзь набыць пейзаж з яблынькай або са старой сялянскай хатай.

Вось як вытлумачвае гэта вядомы даследчык выяўленчага мастацтва, доктар мастацтвазнаўства Валерый Жук у прадмове да альбома жывапісу мастака: «У жыцці людзей цяпер усё выразней узнікае неабходнасць у прыгажосці і гармоніі насуперак дысанансам і дысгармоніі, якія суправаджалі мастацтва XX стагоддзя і адлюстроўвалі катастрафічныя змены, войны і разбурэнні. Усё гэта — прыгажосць і гармонію — і імкнецца ў меру сіл папоўніць сваімі творамі Валерый Шкаруба. І калі верыць, што мастак пачынаецца там, дзе ўзнікае кантакт з прыродай, то ў Валерыя Шкарубы гэты кантакт адбыўся. Менавіта захапленне прыродай прымушае яго, а разам з ім і нас, гледачоў, глыбей зазірнуць сабе ў душу, адчуць ледзь даступнае воку эмацыянальнае жыццё роднай зямлі, яе цеплыню і жыватворную сілу». Хіба будзе хто з гэтым спрачацца?



# ГАЛЕРЭЯ

**У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры яшчэ доўжыцца выстава старадаўняга срэбра, якую за яе гісторыка-культурную і эстэтычную вартасць слушна было назваць адной з лепшых у 2007 годзе. І адчынілася новая цікавая экспазіцыя — філатэлістычная. Падрыхтавана яна пры спрыянні Амбасады ЗША.**

Выстава «Марк Шагал. Штрыхі біяграфіі і творчасці» прысвечана 120-м угодкам народзінаў мастака. Вядома, выставу трэба ўважліва глядзець, але ўжо зараз, мяркуючы па інтэнсіўнай медыйнай апрацоўцы масавай свядомасці, можна меркаваць, што на Беларусь насоўваецца своеасаблівае «шагалаўскае зацьменне».

У Музеі сучаснага мастацтва экспануецца супольны праект маладых творцаў, дызайнераў і фотамастакоў з інтрыгуючым назовам «*Затриморья*». Мастакі розныя, аднак прафесійна падрыхтаваныя — магістры, мастацтвазнаўцы, аспіранты — вынаходнікі новых стыляў (як сказана ў інфармацыі), у прыватнасці, «кітчавага вобразу сучаснасці — спалучэння форм і жанраў Гламуру, Дэкадансу, Готыкі, Хорара і Эротыкі».

Сапраўдная перлінай сталася выстава твораў Уладзіміра Іванавіча Стэльмашонка да 80-годдзя з дня нараджэння народнага мастака, а таксама прысвечаная 50-м угодкам творчасці ў НММ РБ. Юбіляр не проста выдатны мастак-універсал (станкавіст, манументаліст, займаўся дэкаратыўна-ўжытковым мастацтвам, графікай і сцэнаграфіяй), але і надзвычай інтэлігентны, сумленны і думны чалавек з узорна высокай мастацкай адукацыяй, удзельнік шматлікіх выставаў самых высокіх міжнародных узроўняў.

Выстава Стэльмашонка складаецца з 40 графічных аркушаў. Натуральна, усё ўбачанае цікавіла, кранала, уражвала і знаходзіла сваё ўвасабленне ў новым творы. Чым уважлівей глядзіш выставу, тым больш прыходзіш у захапленне. Работы настолькі розныя — і па стылёвых прыёмах, і, натуральна, па тэмах, — але ўсе на выключна высокім узроўні майстэрства. Эпічныя, панарамныя і аб'ёмныя, камерна-лірычныя і драматычныя, партрэты, краявіды ландшафтныя і індустрыяльныя. Безліч усяго. Майстар нібыта праваруе гледача, нібы кажа: магу працаваць шырокім пэндзлем па вільготнай паперы, магу грызыйлам, магу арганічна падтрымаць вобраз, магу… і так да бясконцасці. Гэта стыль Стэльмашонка.

Падрыхтаваў Сяргей Гваздзёў

У СУСЕДЗЯЎ

# У КУЛЬТУРЫ — УРАТАВАННЕ ДЛЯ ДУШЫ

## АБО АДЗІН СА СПОСАБАЎ НАСТРОІЦЦА НА ПІЦЕРСКІ ЛАД

Таццяна МОНЦІК

**Прызвычайвацца жыць на новым месцы няпроста. Асабліва калі мяняеш горад, дзе шмат сонечных дзён, на горад, дзе па сутнасці паўгода цягнецца сумесь асенне-зімовага сезону, які толькі на непрацяглы час перарываецца знакамітымі на ўвесь свет *белымі начамі*. Першая рэакцыя на змены — сум, туга, смутак, настальгія па незваротнаму кіеўскаму мінуламу.**



Першая спроба абараніць сябе ад чужога варожага месца — сыход у дэпрэсію. Але калі мінае пэўны час, робіцца відавочна, што гэты спосаб змагання з рэчаіснасцю выглядае бязглуздым, з'яўляецца непераадольнае жаданне... змяніць сябе, калі ты ўсё адно не здольны памяняць абставіны.

Дзякуй Богу, у Піцеры ёсць для гэтага безліч магчымасцей. Каб пазбавіцца ад дурных думак, варта (і нават неабходна) з галавой увайсці ў бурлівае культурнае жыццё горада — а такую разнастайнасць рэдка сустрэнеш у якім-небудзь іншым горадзе свету.

### Тэатр

Першае знаёмства з піцерскімі тэатрамі распачалося з Малога драматычнага, так званага Тэатра Еўропы. На шчасце, так склалася, што ён знаходзіцца на нашай вуліцы, — дзве хвіліны пешкі ад маёй хаты (зрэшты, і большасць іншых тэатральных устаноў недалёка). Спектаклі, што я паглядзела на гэтай сцэне — «П'еса без назвы» А. П. Чэхава і «Дурыкі» А. М. Астроўскага, — сапраўды здольныя паспрыяць больш аптымістычнаму настрою. І нават нягледзячы на тое, што згубленых і для сябе і для грамадства вясковы настаўнік Платонаў з чэхаўскай п'есы — мізэрнае і гаротнае стварэнне. Ды і роля, адведзеная яму рэжысёрам, яшчэ больш падкрэслівае, які ўбогі і варты жалю галоўны герой: за ўсю дзею ён практычна не вылазіць з сажалкі, усталяванай на сцэне. У ёй Платонаў купаецца пасля чарговай п'янкі, у ёй жа ладзіць рамантычныя спатканні, там жа спакушае маладых прыгажунь і станістых памешчыц.

Нават пасля двух візітаў у МДТ робіцца зразумела, што наведваецца ў Тэатр Еўропы варта як мага часцей. І не толькі праз выдатную працу яго мастацкага кіраўніка Додзіна і выключную ігру акцёраў (сярод іх — Таццяна Шастакова, Вольга Рапапорт, Ірына Тычыніна, Сяргей Курышаў), аднак і праз публіку, што сюды прыходзіць. Таму што не толькі артысты ствараюць атмасферу ў тэатры, але і людзі, для якіх рыхтуюцца спектаклі і якія гэтыя п'есы пазней «спажываюць».

Падчас перапынку ёсць магчымасць больш уважліва прыглядзецца да «сярэднестатыстычнага наведвальніка» гэтага тэатра. Гэта інтэлігентныя людзі і маладога, і вельмі сталага веку, сціпла апранутыя, з добрымі манерамі, і — што надзвычай істотна — яны някепска абазнаныя ў тэатральным мастацтве (пра гэта можна меркаваць, калі прыслухацца да іх размоваў). Многія гледачы цудоўна ведаюць п'есы, добра знаёмыя з артыстамі, так што могуць нават параўноўваць іх ігру. Відавочна, большасць з наведвальнікаў ходзіць у МДТ як да сябе дадому.

### Балет

Напярэдадні Новага году маё асабістае для самой сябе адкрыццё творчасці Барыса Эйфсмана стала самым сапраўдным падарункам. Я даведалася, што гэтаму харэографу было дазволена стварыць свой уласны тэатр балета яшчэ ў савецкія часы, у 1977 годзе. Гэта надзвычайна, асабліва калі ўзгадаць, што ў СССР шанавалі, па сутнасці, толькі адзін від балету — класічны, а Эйфман ужо на той час камбінаваў у сваёй творчасці ўсе магчымыя віды танцу, прычым рабіў і робіць гэта арганічна, у чым яму ў вельмі спрыяе выбар музыкі. Пасля эйфманаўскай «Чырвонай Жызелі», якая была пастаўлена на музыку Чайкоўскага, Шнітке і Бізэ ды распавядала пра творчасць і пакуты балерыны Спясіўцавай да і пасля рэвалюцыі 1917 года, мы атрымалі моцны стымул уважліва прыслухоўвацца кожны раз, калі чуем анонсы выступаў тэатру Барыса Эйфмана.

Пры ўсім захапленні экспрэсіяй і сілай эйфманаўскага перфомансу, нельга не заўважыць два не вельмі прыемныя нюансы. Па-першае, наведваць яго балеты — не для бедных (таму што нават не самыя лепшыя месцы абыходзяцца ў рублёў 800 — больш за 20 еўра). Па-другое, злёгку шакуе публіка, што прыходзіць на спектаклі, — яе варта ахарактарызаваць, мякка кажучы, як не надта выхаваную і цалкам не абазнаную не толькі ў балеце, а нават у элементарнай культуры. Бо як інакш можна патлумачыць той факт, што ў фінале выключна таленавітага балета гледачы (асабліва тыя, што займаюць самыя дарагія месцы ў партэры) замест выказвання ўдзячнасці артыстам імкнуцца як найхутчэй заняць месцы... у чарзе ў гардэроб? Для іх, здаецца, удалы паход у тэатры — гэта па магчымасці хуткі выхад з яго.

### Вечар аперэты

Пра Міхайлаўскі тэатр, дзе адбываюцца оперныя і балетныя пастаноўкі, варта распавесці больш падрабязна. Будынак гэтага тэатра на Плошчы мастацтваў быў не так даўно адрэстаўраваны і адрамантаваны так, што можа годна канкураваць па свайму ўнутранаму ўбранню, бадай, з самымі вядомымі еўрапейскімі операмі і не ў чым ім не саступіць: інтэр'ер Міхайлаўскага тэатру багаты і густоўны. Нават калі папросту ў антракце гуляеш па яго калідорах, уздымаецца настрой.

Наш паход у Міхайлаўскі тэатр быў прымеркаваны да вечару аперэты з Аленай Абразцовай і Сяргеем Лейферкусам. На жаль, мы былі моцна расчараваныя. Напэўна, уся справа ў тым, што славутай opernай спявачцы, якой ужо далёка за 60, варта было добра разважыць, перш чым брацца за галіну, у якой яна раней не была добра абазнанай. Падчас канцэрту Абразцова колькі разоў зрывалася на іншую танальнасць, здаралася — відавочна фальшывіла, а адзін раз і наогул замаўчала на некалькі імгненняў, чым збянтэжыла і аркестр, і сваіх калегаў па сцэне, і нас, публіку. Лейферкус быў, напэўна, нават «мацней» за сваю зорную калегу, аднак цяжка сказаць, што і для яго гэты вечар быў самым удалым. Найлепшае ўражанне засталося ад галоўнага дырыжора Андрэя Аніханава, які з запалам кіраваў аркестрам і прыўзняў настрой гледачам.

Цікавы нюанс: за пару дзён да вышэйзгаданага вечара аперэты тэатр раптам перапыніў продаж квіткоў праз тэатральныя касы гораду. Такім чынам, квіткі можна было набыць толькі ў касе Міхайлаўскага ўжо ў два або тры разы даражэй (напрыклад, за квіткі, што каштавалі ў тэатральнай касе горада 440 рублёў, нам давялося заплаціць ажно 1200!). Мушу прызнацца: выдаткаваных грошай было вельмі шкада, асабліва з улікам якасці канцэрту і яго непрацягласці — дзве гадзіны разам з антрактам.

Асобны абзац пра публіку Міхайлаўскага. У першую чаргу, гэта людзі не бедныя, сярод іх замежнікі, бізнесоўцы і так званы славуты «сярэдні клас». Асаблівае месца займае досыць спецыфічная група людзей — мясцовыя старыя, прычым не гаротныя і закіданыя, а здаровыя і добра ўбраныя. Асабліва ўразілі немаладыя пані, якіх язык не паварочваецца назваць «бабулькамі». Яны не толькі ахайна, а нават стыльна і густоўна апранутыя, з макіяжам і фрэзурамі. У гардэробе яны пакідалі свае шыкоўныя норкавыя манто, а ў фешэнебельнай кавярні цалкам маглі дазволіць сабе бакал шампанскага за 270 рублёў і бутэрброд з ікрой за 360.

### Сімфонія

А зараз пра месца, куды мы першы раз патрапілі выпадкова, але цяпер сталыя яго наведвальнікі. Гэта палац Беласельскіх-Белазерскіх, дзе ў савецкія часы, кажуць, урачыста прымалі ў камсамол. Зараз тут на выхадныя адбываюцца цікавыя канцэрты Пецярбургскага сімфанічнага аркестру — па абанементах. Нягледзячы на тое, што інтэр'ер калісьці шыкоўнай бальнай залы да гэтага часу захоўвае «піянерска-камсамольскі шарм», наведванне гэтага месца — вартая справа. Па-першае, канцэрты можна абіраць паводле густу, настою і з розных абанементаў: яны адбываюцца кожныя выхадныя два разы на дзень (натуральна, выконваюцца розныя музычныя творы). Перад пачаткам канцэртаў — падрабязны расповед музыказнаўцы пра розныя мастацкія накірункі, эпохі і аналіз твораў, што прагучаць. Карысная справа!

Што да публікі, то гэта яшчэ менавіта тая, піцерская. Сапраўдныя аматары мастацтва. Найперш, гэта адкрытыя і добразычлівыя людзі, часцей за ўсё далёка не заможныя. Здаецца, што менавіта пра такіх ідзе размова, калі распавядаюць пра рассяленне камуналак. Менавіта такія старыя — не ад добрага жыцця — вымушаны перасяляцца са сваіх камунальных кватэр на ўскраіны горада. На канцэрт яны прыходзяць групамі, часам па пяць-сем чалавек. Напэўна, гэта месца ў цэнтры горада абранае імі даўно, таму што хадзіць на канцэрты па выхадных — іх даўняя традыцыя. Да і кошты тут невысокія — танней за кубак кавы ў суседняй кавярні «Кава Хаўс»...

▸ БАРДАЎСКАЯ ПЕСНЯ

# ДЗЕ ЯНА, ЗАЛАТАЯ КРЫВІЯ?

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**У рамках фанаграфічнай серыі «Беларускі музычны архіў», якая стала своеасаблівай візітоўкай музычнага выдавецтва БМАgroup, не так даўно пабачыў свет яшчэ адзін дыск з узорамі класікі беларускай бардаўскай песні. Маем на ўвазе альбом з кампазіцыямі Эдуарда Акуліна «Песьні залатой Крывіі».**

Нагадаю, што Эдуард Акулін — вядомы беларускі паэт, перакладчык, бард, намеснік старшыні апальнага ў сённяшніх уладаў Саюза беларускіх пісьменнікаў, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Дзеяслоў». Асаблівасць згаданага дыска ў тым, што на яго трэках змешчаны песні, якія сталі стрыжнем для двух ранейшых альбомаў Э. Акуліна — «Мая Крывія» (1995) і «Як яна і я» (2000). І таму праграма гэтага дыска ўяўляе сабой амаль поўны фанаграфічны збор лепшых кампазіцый барда. Трэба адзначыць, што ў адрозненне ад запісанага ў хатніх умовах напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя першага варыянту «Маёй Крывіі», запісы гэтага дыска — студыйныя, высокай якасці.

Як і ўсе папярэднія дыскі серыі «Беларускі музычны архіў», «Песьні залатой Крывіі» Эдуарда Акуліна пачынаюцца з грунтоўнага ўводнага артыкула да гэтага калекцыйнага выдання. Паколькі згаданае музычна-літаратурнае даследаванне ажыццявіў аўтар гэтых радкоў, то мушу апусціць біяграфічныя звесткі пра знанага паэта і барда Эдуарда Акуліна, спадзеючыся, што з імі чытачы змогуць больш шчыльна пазнаёміцца, калі набудуць і праслухаюць дыск.

Я ж хачу зноў звярнуць увагу на паэтычны аспект творчасці барда. А ён палягае ў прыхільнасці, як адзначалася ў шматлікіх рэцэнзіях на альбомы барда, да традыцыйна-класічнага кірунку. Прапаную праслухаць галоўны трэк альбому — кампазіцыю «Мая Крывія». Упэўнены, слухачы адзначаць яго як сапраўдны гімн роднай зямлі, прыгажосці крывіцкай Атлантыды — любімай Беларусі. У тым, што гэта так, можна ўпэўніцца нават без музычнага суправаджэння:

*Зямля векавых бароў.*
*Зямля васільковай рані.*
*Зямля залатых буслоў*
*У промнях касых світання...*

Што ж тычыцца мелодыі, то сваёй узнёсласцю яна арганічна дапаўняе вершаваныя радкі і робіць песню адным з класічных твораў беларускай бардаўскай песні. «Крыўская» тэматыка, зітаваная з паэтычным асэнсаваннем светапогляду яго ўлюбёнага Максіма Багдановіча, праходзіць праз усю творчасць Эдуарда Акуліна. Мо таму так пранікнёна, поклічна гучыць адно з самых яркіх музычных прысвячэнняў класіку нашай паэзіі — песня «Зорка Максіма». Калі слухаеш песню, то ўсёй душой верыш у шчырасць вось гэтых радкоў, якія спяваюцца аўтарам быццам ад асобы нашага Страціма-Лебедзя:

*Месячнай цёплай ноччу*
*Шляхам апошнім млечным*
*Ціха ў Сусвет пакрочу.*
*Буду сабе свяціць...*
*Каб і адтуль, з нябёсаў.*
*Каб і адтуль, з далечы.*
*Бачыць цябе, Радзіма.*
*І як цяпер любіць...*




Фота з архіва Э. Акуліна

Але не толькі лірычным асэнсаваннем багдановічаўскай «чыстай красы» ў паэзіі характэрна творчасць Эдуарда Акуліна. Адна з заўважных якасцей паэта, які спявае, — публіцыстычнасць многіх яго лепшых кампазіцый. І ў гэтым ён родна сны такім беларускім бардам-трыбунам, як Сяржук Сокалаў-Воюш ці Андрэй Мельнікаў. Бо ўсе гэтыя выканаўцы — аднагодкі эпохі вялікага змагання за Незалежнасць Беларусі і Адраджэнне мовы нашага народа. Таму мы яшчэ і яшчэ раз будзем спрабаваць асэнсоўваць змест паэтычных метафар Эдуарда Акуліна і ўслухоўвацца ў зіхатлівы пераліў мелодый такіх песень альбома, як «Сьляза па Кастусю Каліноўскаму», «Над маёй Радзімай...», «Атлянтыда», «Гэта мы!», «Жыве Беларусь!», каб самім зразумець і адчуць, што Слова жыве і змагаецца...

Адна з яскравых іпастасяў Акуліна-кампазітара — стварэнне песень, прысвечаных каханню, любай жанчыне. Іх добра ведаюць прыхільнікі творчасці Акуліна і не без падстаў лічаць, што менавіта ў лірычнай песні аўтар выяўляе самыя эмацыянальныя бакі сваёй паэзіі. Гэтаму дапамагае не толькі інтымны змест песень, пранікнёныя, кранальныя мелодыі, але і голас барда, які захапляе сваім чыстым тэмбрам, магчымасцямі перадаваць шматлікія эмацыянальныя адценні той ці іншай кампазіцыі. На гэтую асаблівасць выканаўчай манеры Акуліна звяртаў увагу вядомы музычны крытык Вітаўт Мартыненка ў сваёй рэцэнзіі на зборны альбом «Напачатку была Песьня» (2003), якая змешчана ў кнізе «222 альбомы беларускага року і ня толькі...». Аўтар рэцэнзіі адзначаў: «Дзякуючы пяшчотнаму голасу, які прэса параўноўвала з манерай Хуліё Іглесіяса і Джо Дасэна, а таксама праз мудрыя і кранальныя тэксты, якія маюць бясспрэчную прыналежнасць да высокай паэзіі, Эдуард Акулін паспеў ужо трапіць у пантэон класікаў жанру». Таму не толькі крытыкі, але і слухачы даўно ўжо аднеслі такія кампазіцыі Э. Акуліна, як «Чужая жонка», «Забяры мяне ў дождж валасоў...», «Сумую без тваіх воч», «Пяшчота ліўня», «Як яна і я...» да лепшых прыкладаў традыцыйнай бардаўскай песні, прадстаўленых на гэтым альбоме.

Лірычныя фарбы дапамагаюць Эдуарду не толькі выяўляць свае пачуцці да каханай жанчыны, але і выказваць пяшчоту да мясцін, дзе нарадзіўся і вырас, дзе адчуў смак першых вершаваных радкоў. Каб зразумець, дзе знаходзіцца тая запаветная зямля Крывіі, трэба абавязкова зрабіць вандроўку на Веткаўшчыну, у яго родную вёску Вялікія Нямкі. Туды, дзе працякае рака Бесядзь, якая з'яўляецца для Э. Акуліна, па яго трапным метафарычным прызнанні, паэтычным Іарданам. Менавіта тут чуйная душа вясковага хлапчука выявіла захапленне непаўторнымі краявідамі Радзімы, адчула моц матчынага слова і магчымасці паэтычных вобразаў, якія ўсё жыццё будуць наталяць яго прагу да прыгажосці, выяўляцца ў вобразным строі яго паэзіі, у цудоўных песнях. Так, як гэта можна адчуць у песні-прысвячэнні «Дзе Бесядзь хваляй...».

І цяпер Эдуард Акулін часта на сваіх канцэртах застаецца сам на сам з гітарай і слухачамі. Ён не імкнецца запрашаць на сцэну ў падтрымку сабе бэк-вакалістаў і сесійных музыкаў. Як і раней, бард любіць ісці са сваімі слухачамі ўслед за паэтычнай зоркай Багдановіча. І глыбокі, пачуццёвы альбом «Песьні залатой Крывіі» Эдуарда Акуліна — лепшае сведчанне плённасці гэтага шляху!

▸ ГАДАВІНА

## РОДНАМУ СЛОВУ — 20 ГАДОЎ

**Усё вялікае пачынаецца з малога. Гэта аксіёма выдатна стасуецца з гісторыяй часопіса «Роднае слова». Напачатку быў невялікі раздзел «Беларуская мова і літаратура ў школе» ў часопісе «Народная асвета».**



З цягам часу матэрыялаў станавілася ўсё больш, таму ўзнікла неабходнасць асобнага выдання для метадычных распрацовак па беларускай мове і літаратуры. Так у студзені 1988-га выйшаў першы нумар штомесячнага навукова-метадычнага часопіса «Беларуская мова і літаратура ў школе», заснавальнікам якога з'яўлялася Міністэрства асветы Беларусі. У 1992-м часопіс змяніў назву на «Роднае слова». Абноўленае выданне абрала шырокі культурна-асветніцкі кірунак. На яго старонках друкуюцца матэрыялы па гісторыі, архітэктуры, культуры, міфалогіі. Аўтарамі матэрыялаў з'яўляюцца вядомыя пісьменнікі, акадэмікі, дактары і кандыдаты навук, перадавыя метадысты і настаўнікі.

25 студзеня рэдакцыйны калектыў часопіса «Роднае слова» ўрачыста адзначыў свой 20-гадовы юбілей. За гэты час убачылі свет 240 нумароў выдання, якое фактычна з'яўляецца лідэрам на рынку навукова-метадычнай перыёдыкі Беларусі.

Рэдакцыя «Новага часу» віншуе калектыў «Роднага слова» з юбілеем і жадае плёну ў іх творчай дзейнасці дзеля актывізацыі педагагічнай думкі, духоўнага і разумовага развіцця асобы.

▸ АНОНС

## БАРДЫ І ЖУРНАЛІСТЫ ПРЭЗЕНТУЮЦЬ

**2 лютага** ў тэатральнай зале Чырвонага Касцёла пройдзе творчая вечарына паэта-барда Эдуарда Акуліна з прэзентацыяй альбома «Песьні Залатой Крывіі». У імпрэзе бяруць удзел: Алесь Камоцкі, Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Леанід Дранько-Майсюк, Кастусь Герашчанка, Анатоль Мяльгуй, Віталь Супрановіч і іншыя. Пачатак 18:00. Уваход вольны.

**3 лютага** ў тэатральнай зале Чырвонага Касцёла пройдзе сустрэча з аўтарамі і героямі кнігі «222 альбома беларускага року і ня толькі». Удзельнічаюць: Вітаўт Мартыненка, Анатоль Мяльгуй, Лявон Вольскі (N.R.M.), Алег Хаменка (Палац), Андрэй Плясанаў (P.L.A.N.), Яраш Малішэўскі (Pete Paff), Зміцер Бартосік ды інш. Пачатак 18:00. Уваход вольны.

**Даведкі па тэлефоне: 6490888**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 288–23–52.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

**АДРАС:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 28017 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html
Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутос-Маркет». Мінск, вул. Кульман, 1.
Замова №

Падпісана да друку 25.01.2008. 8.00.
Наклад 3000 асобнікаў.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.